ЗАЦВЯРДЖАЮ
Міністр адукацыі
Рэспублікі Беларусь
________А. І. Іванец
_________________________
«15» ліпеня 2025 г.

**Інструктыўна-метадычнае пісьмо**
**«Асаблівасці арганізацыі сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі ў 2025/2026 навучальным годзе»**


I. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ
II. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ
III. АДЗІНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАРАДКУ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ З ПРАЦОЎНЫМ КАЛЕКТЫВАМ
IV. ЗМЕСТ АСНОЎНЫХ НАПРАМКАЎ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ З ВУЧНЯМІ ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ Ў 2025/2026 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ
*4.1. Ідэалагічнае, грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне*
*4.2. Сямейнае выхаванне. Узаемадзеянне з сем’ямі вучняў*
*4.3. Працоўнае выхаванне. Прафарыентацыйная работа*
*4.4. Фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця і выхаванне культуры бяспекі жыццядзейнасці*
*4.5. Фарміраванне прававой і інфармацыйнай культуры*
*4.6. Духоўна-маральнае выхаванне*
*4.7. Эканамічнае выхаванне*
*4.8. Фарміраванне ў вучняў беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання*
*4.9. Сацыяльна-педагагічная падтрымка і аказанне псіхалагічнай дапамогі*
*4.10. Прафілактыка злачынстваў і правапарушэнняў*
V. ДАДАТКІ
*Дадатак 1. Цыклаграма мерапрыемстваў па ідэалагічнай рабоце з працоўным калектывам на 2025/2026 навучальны год*
*Дадатак 2. Каляндар дзяржаўных свят, святочных дзён, памятных і святочных дат*
*Дадатак 3. Цыклаграма мерапрыемстваў выхаваўчай накіраванасці з вучнямі ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, на 2025/2026 навучальны год*

*Дадатак 4. Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі экскурсій для вучняў I–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у рамках арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку ў шосты школьны дзень*

*Дадатак 5. Вядзенне праграмна-плануючай дакументацыі выхавання*

*Дадатак 6. Пералік нарматыўных дакументаў для арганізацыі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі*

## 1. АГУЛЬНЫЯ ПАЛАЖЭННІ

Інструкцыйна-метадычнае пісьмо па арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі (далей – УАСА) накіравана на ўдасканаленне падыходаў да планавання, арганізацыі і рэалізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы.

Арганізацыя ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва УАСА ў 2025/2026 навучальным годзе павінна ажыццяўляцца ў поўнай адпаведнасці з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Дырэктывай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы» ад 09.04.2025 г. № 12, Канцэпцыяй бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі ў Рэспубліцы Беларусь, Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2021–2025 гады.

Звяртаем увагу, што пасля зацвярджэння Праграмы бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2026–2030 гады ў праграмы выхаваўчай работы УАСА неабходна будзе ўнесці адпаведныя змены.

Планаванне ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва УАСА неабходна ажыццяўляць з улікам:

цыклаграмы мерапрыемстваў па ідэалагічнай рабоце з працоўным калектывам на 2025/2026 навучальны год (дадатак 1);

календара дзяржаўных свят, святочных дзён, памятных і святочных дат (дадатак 2);

цыклаграмы мерапрыемстваў выхаваўчай накіраванасці з вучнямі ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, на 2025/2026 навучальны год (дадатак 3);

метадычных рэкамендацый па арганізацыі экскурсій для вучняў I–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у рамках арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку ў шосты школьны дзень (дадатак 4).

У 2025/2026 навучальным годзе УАСА неабходна:

працягнуць работу па асноўных напрамках выхавання;

забяспечыць выкананне правіл бяспечных паводзін і арганізацыю бяспечных умоў для вучняў, іх бацькоў (законных прадстаўнікоў), педагагічных работнікаў;

забяспечыць безумоўнае выкананне пастаноў калегіі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь: ад 16.04.2025 № 7 «Уцягванне моладзі ў дзейнасць грамадскага аб'яднання "Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі": ад праектаў да сістэмы і якасці работы»; ад 10.05.2024 № 7.1 «Аб дзейнасці ўстаноў адукацыі па прафілактыцы суіцыдаў»; ад 10.05.2024 № 7.2 «Аб стане работы па супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў»; ад 17.06.2025 № 11 «Аб дзейнасці ўстаноў адукацыі па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх»;

актывізаваць узаемадзеянне з грамадскімі аб'яднаннямі па ўкараненні сучасных форм і метадаў работы з педагагічнымі работнікамі і вучнямі;

арганізаваць пастаяннае міжведамаснае ўзаемадзеянне УАСА з установамі культуры, органамі ўнутраных спраў, структурамі Міністэрства па надзвычайных сітуацыях, Міністэрства абароны, Міністэрства аховы здароўя, Дзяржаўнага пагранічнага камітэта і іншымі дзяржаўнымі структурамі;

забяспечыць якаснае змястоўнае напаўненне шостага школьнага дня з улікам тэматычных субот;

забяспечыць максімальнае далучэнне вучняў да грамадска-карыснай дзейнасці, мерапрыемстваў ідэалагічнага і выхаваўчага характару;

працягнуць работу па папулярызацыі сярод вучняў інфармацыйных рэсурсаў канструктыўнай накіраванасці («ПАТРИОТ.BY», «Моладзь Беларусі», «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя», «Дзіцячы прававы сайт», Moladz.by і г. д.).

Звяртаем увагу на недапушчальнасць неабгрунтаванай падрыхтоўкі планаў і справаздач па розных напрамках выхаваўчай і прафілактычнай работы, у тым ліку ў рамках рэспубліканскіх акцый, месячнікаў, мерапрыемстваў. Педагагічныя работнікі павінны прадстаўляць справаздачы аб сваёй рабоце толькі двойчы на год: да 30 студзеня і да 30 чэрвеня бягучага навучальнага года.

У мэтах павышэння эфектыўнасці ўзаемадзеяння ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу і выключэння некарэктных паводзін, у тым ліку праяў эмацыйнай агрэсіі, непаважлівага або прадузятага стаўлення да вучняў, педагогам варта ў сваёй дзейнасці кіравацца Правіламі педагагічных работнікаў (загад Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 10.06.2022 г. № 401).

## 2. НАВУКОВА-МЕТАДЫЧНАЕ ЗАБЕСПЯЧЭННЕ ВЫХАЎВАЎЧАЙ РАБОТЫ

Пры планаванні і рэалізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва УАСА мэтазгодна выкарыстоўваць навукова-метадычныя рэсурсы:

раздзел «Арганізацыя выхавання» на нацыянальным адукацыйным партале (https://vospitanie.adu.by);

раздзел «Метадычнае суправаджэнне выхаваўчай работы» на сайце дзяржаўнай установы адукацыі «Акадэмія адукацыі» (https://akademy.by/index.php/ru/metodic/metodicheskoe-soprovozhdenie);

электронныя версіі дапаможнікаў па выхаваўчай рабоце для УАСА, якія атрымалі грыфы «Рэкамендавана навукова-метадычнай установай “Нацыянальны інстытут адукацыі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь”», «Рэкамендавана дзяржаўнай установай адукацыі “Акадэмія адукацыі”» (https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/uchebno-metodicheskaya-literatura.html); https://akademy.by/index.php/ru/metodic/metodicheskoe-soprovozhdenie) (вучэбна-метадычная літаратура);

вучэбныя праграмы факультатыўных заняткаў выхаваўчай накіраванасці, зацверджаныя Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь (https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/uchebnie-programmi-fakultativnih-zanyatij.htm);

метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (https://adu.by/ru/homeru/obrazovatelnyj-protsess-2023-2024-uchebnyj-god/dopolnitelnoe-obrazovanie-detej-i-molodezhi?format=html).

Пры арганізацыі выхаваўчай работы варта выкарыстоўваць матэрыялы навукова-метадычных часопісаў:

**«Веснік адукацыі»** – інфармуе аб нарматыўна-прававым і навукова-метадычным забеспячэнні адукацыйнага працэсу;

**«Выхаванне і дадатковая адукацыя»** – аказвае інфармацыйна-метадычную падтрымку педагагічным работнікам, якія ажыццяўляюць працэс выхавання;

**«Диалог»** – прадстаўляе вынікі актуальных навуковых даследаванняў, тэарэтычныя і прыкладныя аспекты вырашэння сацыяльна-педагагічных і псіхалагічных праблем;

**«Здоровый образ жизни»** – публікуе сцэнарыі фізкультурна-аздараўленчых і спартыўна-масавых мерапрыемстваў, практычныя рэкамендацыі метадыстаў, педагогаў-наватараў, урачэй па прафілактыцы залежнасцей, траўматызму.

Пры арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага, ідэалагічнага выхавання вучняў, мерапрыемстваў прафілактычнай накіраванасці неабходна выкарыстоўваць відэаматэрыялы, сфарміраваныя тэлеканалам АНТ (https://vospitanie.adu.by/component/content/article/aktualnye-praktiki-i-tekhnologii-vospitaniya.html?catid=22&Itemid=101).

Актуальная інфармацыя аб пераліку навучальных праграм павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў адукацыі размешчана ў

раздзеле «Навучанне» на сайце Акадэміі адукацыі (*https://akademy.by/index.php/ru/obuchenie/povyshenie-kvalifikatsii*).

Звяртаем увагу, першакрыніцай дакладнай і актуальнай прававой інфармацыі з’яўляецца эталонны банк даных прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь, які фарміруецца Нацыянальным цэнтрам заканадаўства і прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь і распаўсюджваецца ў складзе інфармацыйна-пошукавых сістэм «ЭТАЛОН» і «ЭТАЛОН-ONLINE» (далей – ІПС) (*etalonline.by*). У ІПС функцыянуюць і пастаянна абнаўляюцца наступныя тэматычныя банкі даных (далей – БД): БД «Адукацыя», БД «Правы непаўналетніх», БД «Тэхнічныя нарматыўныя прававыя акты». Усе дакументы, уключаныя ў БД, сістэматызаваны па тэматычных раздзелах. Тэксты нарматыўных прававых актаў знаходзяцца ў актуальным стане.

## 3. АДЗІНЫЯ ПАТРАБАВАННІ ДА ПАРАДКУ АРГАНІЗАЦЫІ І ПРАВЯДЗЕННЯ ІДЭАЛАГІЧНАЙ РАБОТЫ З ПРАЦОЎНЫМ КАЛЕКТЫВАМ

Ідэалагічная работа ў працоўных калектывах павінна быць накіравана на падтрымку ўнутранай і знешняй палітыкі Рэспублікі Беларусь, умацаванне спрыяльнага маральна-псіхалагічнага клімату, фарміраванне ў членаў працоўнага калектыву светапогляду, заснаванага на пачуцці патрыятызму, грамадзянскай сталасці, усведамленні прыналежнасці да беларускага народа, прафесійнай і асабістай адказнасці за дасягненне высокіх вынікаў у рабоце.

Арганізацыя ідэалагічнай работы ў працоўных калектывах ускладаецца на кіраўніка ўстановы адукацыі, непасрэдная каардынацыя ідэалагічнай работы – на намесніка кіраўніка па выхаваўчай рабоце.

Пры планаванні ідэалагічнай работы з працоўным калектывам ва УАСА неабходна выкарыстоўваць цыклаграму мерапрыемстваў па ідэалагічнай рабоце з працоўным калектывам на 2025/2026 навучальны год (дадатак 1).

Ва УАСА неабходна:

забяспечыць правядзенне адзіных дзён інфармавання з выкарыстаннем матэрыялаў адзінага інфармацыйнага рэсурсу (тэматычнага БД «Ідэалагічная работа»), размешчанага ў ІПС «ЭТАЛОН-ONLINE»;

арганізаваць рэгулярнае правядзенне кіраўніцтвам УАСА дыялогавых пляцовак, сходаў, круглых сталоў з працоўным калектывам; сустрэч з парламентарыямі і дэпутатамі мясцовых Саветаў дэпутатаў, дэлегатамі Усебеларускага народнага сходу, прадстаўнікамі дзяржаўных органаў і арганізацый, грамадскіх аб’яднанняў, палітычных партый, дзеячамі навукі, культуры і інш.;

арганізаваць прэзентацыю новых выданняў, інфармацыйных матэрыялаў, аўдыявізуальнай і наглядна-выяўленчай прадукцыі па пытаннях рэалізацыі ідэалогіі беларускай дзяржавы;

прыцягваць работнікаў з актыўнай патрыятычнай пазіцыяй да выступленняў па актуальных пытаннях дзяржаўнай палітыкі і ідэалогіі беларускай дзяржавы, аператыўнага абвяржэння ангажыраваных інфармацыйных укідаў, фэйкаў;

прадугледзець правядзенне ўрачыстых мерапрыемстваў (сходаў, канцэртаў, выстаў і інш.), прысвечаных дзяржаўным святам, святочным дням і памятным датам у Рэспубліцы Беларусь, культурна-масавых і спартыўна-аздараўленчых, прафесійных мерапрыемстваў (конкурсаў «Настаўнік года», «Сям’я года УАСА » і інш.);

арганізаваць работу з маладымі спецыялістамі, у тым ліку выкарыстоўваючы практыку інстытута настаўніцтва (пастанова Прэзідыума Савета Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ад 27.01.2011 № 2 «Тыпавое палажэнне аб настаўніцтве», інфармацыйнае пісьмо Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь і Федэрацыі прафсаюзаў Беларусі ад 11.02.2022 № 4-1-12/684/01-09/23 «Аб інстытуце настаўніцтва»), замацаваўшы настаўніцтва персанальна загадам кіраўніка УАСА;

уключаць работнікаў у сацыяльна значную дзейнасць (суботнікі, працоўныя акцыі і інш.).

## 4. ЗМЕСТ АСНОЎНЫХ НАПРАМКАЎ ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ З ВУЧНЯМІ ВА ЎСТАНОВАХ АГУЛЬНАЙ СЯРЭДНЯЙ АДУКАЦЫІ Ў 2025/2026 НАВУЧАЛЬНЫМ ГОДЗЕ

### 4.1. Ідэалагічнае, грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне

Ідэалагічнае выхаванне вучняў павінна быць накіравана на засваенне асноў беларускай ідэалогіі, развіццё ў іх здольнасці аб’ектыўна аналізаваць падзеі, якія адбываюцца ў краіне і свеце, фарміраванне імкнення ўдзельнічаць у грамадскім жыцці.

Для гэтага варта працягнуць практыку правядзення:

адзіных урокаў, прысвечаных памятным падзеям, дзяржаўным святам, знамянальным датам у гісторыі Рэспублікі Беларусь: Дзень ведаў (1 верасня), Дзень народнага адзінства (17 верасня), Дзень Канстытуцыі (15 сакавіка), 83-я гадавіна трагедыі ў Хатыні (22 сакавіка), Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі (2 красавіка), Дзень Перамогі (9 мая), Дзень сям’і (15 мая). Для канструявання сцэнарыя адзінага ўрока варта выкарыстоўваць інфармацыйна-метадычныя матэрыялы, размешчаныя ў раздзеле нацыянальнага адукацыйнага партала «Бібліятэка адзіных урокаў» (*https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/edinie-uroki-uroki-pamyati.html*);

мерапрыемстваў па азнаямленню вучняў з выбарчым заканадаўствам Рэспублікі Беларусь (метадычныя матэрыялы і матрыцы адзіных інфармацыйных гадзін па гэтай тэме размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (https://vospitanie.adu.by/ *Інфармацыйныя і класныя гадзіны*));

мерапрыемстваў інфармацыйна-адукацыйнага праекта «Школа Актыўнага Грамадзяніна» (чацвёрты тыдзень месяца). Інфармацыйна-метадычныя матэрыялы для рэалізацыі праекта будуць размяшчацца на нацыянальным адукацыйным партале (https://vospitanie.adu.by/shkola-aktivnogo-grazhdanina.html);

тэматычных заняткаў па вучэбнай праграме для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям’я. Мая Радзіма» (трэці тыдзень месяца). Інфармацыйна-метадычныя матэрыялы для правядзення тэматычных заняткаў размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (https://vospitanie.adu.by/component/content/article/tematicheskie-zanyatiya-dlya-uchashchikhsya-ii-xi-klassov-ya-moya-semya-moya-rodina.html?catid=41&Itemid=101);

інфармацыйных гадзін па вывучэнні пытанняў генацыду беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны (штомесяц). Пры вывучэнні пытанняў генацыду неабходна выкарыстоўваць вучэбныя дапаможнікі «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» для навучэнцаў I–IV, V–IX, X–XI класаў (складальнікі: В. В. Талкачоў, В. А. Фіневіч, В. В. Таратынка [і інш.]. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2023). Дадзеныя вучэбныя дапаможнікі размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (https://www.adu.by/ru/pedagogam/rassledovanie-ugolovnogo-dela-o-genotside.html). Звяртаем увагу на неабходнасць выкарыстання пры правядзенні выхаваўчых мерапрыемстваў па дадзенай тэме актуальнай інфармацыі, размешчанай на афіцыйным сайце Генеральнай пракуратуры (https://prokuratura.gov.by/ru/activity/rassledovanie-ugolovnogo-dela-o-genotside). У рамках інфармацыйных гадзін па дадзенай тэме рэкамендуецца арганізаваць прагляд і абмеркаванне вучнямі дакументальных фільмаў «Лагеры смерці», «Спаленыя вёскі» (вытворчасць кінастудыі «Беларусьфільм», 2025).

У 2025/2026 навучальным годзе неабходна працягнуць работу па фарміраванні паважлівага стаўлення вучняў да дзяржаўных сімвалаў Рэспублікі Беларусь. З гэтай мэтай неабходна:

забяспечыць правядзенне ўрачыстых мерапрыемстваў, лінеек з узняццем (вынасам) Дзяржаўнага сцяга Рэспублікі Беларусь, выкананнем Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь (загад Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.05.2022 № 368 «Аб удасканаленні работы па патрыятычным выхаванні»);

укараніць у практыку работы УАСА правядзенне лінеек дзяжурнага класа з выкананнем Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь;

ажыццяўляць пастаянны кантроль за станам куткоў дзяржаўнай сімволікі ва ўстановах адукацыі.

Пры арганізацыі ўзаемадзеяння з ГА «БРСМ» і ГА «БРПА» варта арыентавацца на цыклаграму мерапрыемстваў выхаваўчай накіраванасці на 2025/2026 навучальны год (дадатак 3). З інфармацыяй аб мерапрыемствах, якія праводзяцца грамадскімі аб'яднаннямі, можна азнаёміцца на афіцыйных сайтах: «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» (*https://brsm.by*), «Беларуская рэспубліканская піянерская арганізацыя» (*https://brpo.by*). Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі ўзаемадзеяння УАСА з ГА «БРСМ» і ГА «БРПА» размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (*https://vospitanie.adu.by/pedagogu-organizatoru.html*).

У 2025 годзе Рэспубліка Беларусь адзначае 80-ю гадавіну Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне. Памяць пра Вялікую Перамогу – частка нацыянальнай ідэі беларусаў, таму ў 2025/2026 навучальным годзе ва УАСА варта працягнуць работу:

па інфармаванні вучняў аб трагедыі і подзвігу беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны. З гэтай мэтай неабходна праводзіць класныя і інфармацыйныя гадзіны, арганізоўваць прагляд мастацкіх і хроніка-дакументальных кіна- і відэафільмаў аб Вялікай Айчыннай вайне з наступным абмеркаваннем. Пры арганізацыі дадзенай работы неабходна выкарыстоўваць метадычныя матэрыялы Рэспубліканскага культурна-патрыятычнага кінамарафону «Глядзі і памятай» (*https://adu.by/images/2021/04/Kinomarafon-2021.pdf*);

па доглядзе і добраўпарадкаванні мемарыялаў, помнікаў і воінскіх пахаванняў;

па ўдзелу вучняў у мерапрыемствах, прадстаўленых у Плане падрыхтоўкі і правядзення мерапрыемстваў па святкаванні 80-й гадавіны вызвалення Рэспублікі Беларусь ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў і Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне; якія праводзяцца ў рамках рэспубліканскай героіка-патрыятычнай акцыі «Вялікай Перамозе – 80!» (*https://rcek.by/respublikanskaya-geroiko-patrioticheskaya-aktsiya-velikoj-pobede-80*); у штогадовых патрыятычных акцыях «Кветкі Вялікай Перамогі», «Беларусь памятае».

Пры арганізацыі работы па ваенна-патрыятычным выхаванні навучэнцаў варта забяспечыць узаемадзеянне са структурамі і падведамнымі арганізацыямі Міністэрстваў абароны, унутраных спраў, па надзвычайных сітуацыях, культуры, Дзяржпагранкамітэта, ДТСААФа, ваеннымі ветэранскімі арганізацыямі; рэсурснымі цэнтрамі, ваенна-патрыятычнымі клубамі, іншымі зацікаўленымі. Пытанні ўзаемадзеяння

павінны быць узгоднены да пачатку навучальнага года, а адпаведныя сумесныя мерапрыемствы ўнесены ў план выхаваўчай работы ўстановы адукацыі, план работы кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні (далей – кіраўнік ВПВ) на навучальны год.

Важным элементам ваенна-патрыятычнага выхавання з'яўляецца дзейнасць сцяганосных груп. Работу па падрыхтоўцы сцяганосных груп ва УАСА неабходна працягнуць у адпаведнасці з інструкцыйна-метадычным пісьмом «Аб арганізацыі дзейнасці сцяганосных груп ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі» (*https://vospitanie.adu.by/images/2023/11/imp-znamennaya-gruppa.pdf*).

У мэтах развіцця ў вучняў цікавасці да гісторыка-культурнай спадчыны Беларусі, фарміравання пачуцця любові і прыхільнасці да малой радзімы ўстановам адукацыі варта:

стварыць музейныя экспазіцыі, прысвечаныя героям Беларусі;

арганізаваць наведванне вучнямі музеяў кожную апошнюю сераду месяца (адзіны дзень бясплатнага наведвання музеяў вучнямі);

прыняць удзел:

у рэспубліканскім конкурсе на прызы Рэспубліканскага савета па гістарычнай палітыцы пры Адміністрацыі Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «Адкрываем Беларусь» (*https://adu.by/images/2024/04/polozhenie-otkryvaem-Belarus.pdf*);

у акцыях і мерапрыемствах грамадзянска-патрыятычнай і краязнаўчай накіраванасці ў адпаведнасці з Праграмай бесперапыннага выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі на 2021–2025 гады;

у мерапрыемствах, прысвечаных памятным падзеям, знамянальным датам у гісторыі свайго рэгіёна, населенага пункта.

Самую пільную ўвагу ў новым навучальным годзе неабходна надаць развіццю адукацыйнага турызму (дадатак 4).

### 4.2. Сямейнае выхаванне. Узаемадзеянне з сем'ямі вучняў

У 2025/2026 навучальным годзе неабходна працягваць работу па фарміраванні ў вучняў традыцыйных сямейных каштоўнасцей, гатоўнасці да сямейнага жыцця, адказных адносін да шлюбу, сям'і, каштоўнасных адносін да мацярынства і бацькоўства.

Пры арганізацыі тэматычных круглых сталоў, дыскусій, гутарак мэтазгодна запрашаць прадстаўнікоў сферы аховы здароўя, Беларускай праваслаўнай царквы, іншых спецыялістаў па пытаннях сямейнага выхавання.

Пры арганізацыі работы па сямейным выхаванні рэкамендуецца выкарыстоўваць матэрыялы дапаможнікаў, размешчаных на нацыянальным адукацыйным партале (*https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/uchebno-metodicheskaya-literatura.html*).

У 2025/2026 навучальным годзе ва ўсіх УАСА павінна быць працягнута рэалізацыя рэспубліканскага праекта «Бацькоўскі ўніверсітэт» (у адпаведнасці з інструкцыйна-метадычным пісьмом «Аб рэалізацыі ва ўстановах агульнай сярэдняй адукацыі рэспубліканскага праекта “Бацькоўскі ўніверсітэт”» (*https://vospitanie.adu.by/roditelskij-universitet.html*).

Пры рэалізацыі праекта неабходна арыентавацца на «Прыкладную праграму бацькоўскага ўніверсітэта» (*https://www.adu.by/images/2021/12/primernaja-programma-roditelskogo-universiteta.pdf*). Для эфектыўнай рэалізацыі праекта неабходна:

даводзіць да пачатку навучальнага года план мерапрыемстваў да ведама педагогаў, якія выконваюць абавязкі класных кіраўнікоў, педагога-псіхолага і педагога сацыяльнага, бацькоў вучняў;

праводзіць мерапрыемствы праекта ў працоўныя дні (вячэрні час) альбо ў шосты школьны дзень па дамоўленасці з бацькамі вучняў;

выкарыстоўваць аптымальны фармат правядзення мерапрыемстваў праекта – заняткі з бацькамі аднаго класа, якія дазваляюць арганізаваць пазітыўную рабочую абстаноўку і актывізаваць бацькоў-удзельнікаў;

стварыць і пастаянна актуалізаваць на сайтах устаноў адукацыі ўкладку (раздзел) «Бацькоўскі ўніверсітэт», якая змяшчае інфармацыю аб тэматыцы, форме арганізацыі, часе правядзення мерапрыемстваў праекта, памяткі, буклеты, флаеры па тэмах заняткаў і інш.;

уключаць пытанні рэалізацыі рэспубліканскага праекта ў сістэму самакантролю;

выкарыстоўваць для правядзення заняткаў:

інтэрнэт-рэсурсы «Бацькоўскі ўніверсітэт» на сайце БДПУ імя Максіма Танка (*https://roduniversitet.bspu.by*);

матэрыялы раздзела «Бацькоўскі ўніверсітэт» на нацыянальным адукацыйным партале (*https://vospitanie.adu.by/roditelskij-universitet.html*);

дапаможнікі для педагогаў серыі «Бацькоўскі ўніверсітэт», размешчаныя на нацыянальным адукацыйным партале (*https://vospitanie.adu.by/roditelskij-universitet/uchebno-metodicheskaya-literatura.html*).

Дадатковыя справаздачы аб рэалізацыі праекта «Бацькоўскі ўніверсітэт» з боку класных кіраўнікоў, педагогаў-псіхолагаў, кіраўнікоў па ваенна-патрыятычным выхаванні, педагогаў сацыяльных або іншых спецыялістаў не патрабуюцца.

Вядучая роля ў фарміраванні ў вучняў сямейна-шлюбных каштоўнасцей, выхаванні будучага сем’яніна належыць педагагічным работнікам, якія выконваюць функцыі класнага кіраўніка, пры актыўным узаемадзеянні з педагогам-псіхолагам і педагогам сацыяльным установы адукацыі.

Пры арганізацыі ва ўстанове адукацыі выхаваўчых мерапрыемстваў па сямейнай праблематыцы варта ўлічваць узроставыя асаблівасці вучняў, выкарыстоўваць пры арганізацыі работы практычныя рэкамендацыі па фарміраванні сямейна-шлюбных каштоўнасцей у дзяцей, у тым ліку дзяцей-сірот, дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў, моладзі размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/podgotovka-k-semejnoj-zhizni.html).

У 2025/2026 годзе неабходна пашырыць ахоп вучняў IX–XI класаў факультатыўнымі заняткамі «Асновы сямейнага жыцця».

Звяртаем увагу на неабходнасць уліку ў рабоце з сем’ямі вучняў пастановы Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30.12.2024 № 1055 «Аб прызнанні дзяцей, якія знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы і маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне», Метадычных рэкамендацый па міжведамасным узаемадзеянні дзяржаўных органаў і іншых арганізацый па рабоце з сем’ямі, у якіх дзеці знаходзяцца ў сацыяльна небяспечным становішчы і маюць патрэбу ў дзяржаўнай абароне, зацверджаных 05.05.2025 намеснікам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь К. А. Пятруцкай.

**4.3. Працоўнае выхаванне. Прафарыентацыйная работа**

Працоўнае выхаванне ва УАСА павінна быць накіравана на фарміраванне ў вучняў каштоўнасных адносін да працы, працоўных навыкаў, гатоўнасці і матывацыі да працоўнай дзейнасці.

2025 год аб’яўлены Годам добраўпарадкавання. У адпаведнасці з Галіновым планам мерапрыемстваў Міністэрства адукацыі па правядзенні ў 2025 годзе Года добраўпарадкавання, зацверджаным загадам Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 19.03.2025 № 106, праводзіцца рэспубліканскі агляд-конкурс устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы дашкольнай, агульнай сярэдняй, спецыяльнай адукацыі. Палажэнне аб конкурсе размешчана на нацыянальным адукацыйным партале (https://adu.by/ru/component/content/article/respublikanskij-smotr-konkurs-uchrezhdenij-doshkolnogo-obshchego-srednego-i-spetsialnogo-obrazovaniya-k-godu-blagoustrojstva.html?catid=557&Itemid=101).

Звяртаем увагу, што ў 2025 годзе Міністэрствам адукацыі зацверджаны Метадычныя рэкамендацыі па працоўным выхаванні (https://edu.gov.by/molodezhnaya-politika/glavnoe-upravlenie-vospitatelnoy-raboty-i-molodezhnoy-politiki). Дакумент вызначае механізм замацавання ўстаноў адукацыі за арганізацыямі аграпрамысловага комплексу (далей – АПК) і формы ўзаемадзеяння, сярод якіх азнаямленне вучняў з вытворчымі працэсамі арганізацый АПК, правядзенне летняй працоўнай практыкі з элементамі прафесійнага навучання, запрашэнне спецыялістаў

АПК ва ўстановы адукацыі для правядзення тэматычных класных гадзін, прафарыентацыйных мерапрыемстваў. Метадычныя рэкамендацыі могуць быць адаптаваны з улікам асаблівасцей рэгіёна, узроўню адукацыі і профілю ўстановы адукацыі.

З мэтай фарміравання ў вучняў усвядомленага выбару прафесіі і ўстановы адукацыі для далейшага навучання варта працягнуць працу па арганізацыі часовай працоўнай занятасці вучняў і моладзі ў вольны ад вучобы час, у тым ліку ў студэнцкіх атрадах; актывізаваць наведванне вучнямі прафарыентацыйных мерапрыемстваў «Вучань на дзень», «ПрафКанікулы», дзён адчыненых дзвярэй, рэспубліканскай выставы «Адукацыя і кар’ера» і інш.

Мерапрыемствы прафарыентацыйнага характару павінны быць накіраваны на павышэнне папулярнасці, растлумачэнне сацыяльнай значнасці рабочых прафесій, спецыяльнасцей, павышэнне іміджу прафесійнай адукацыі ў грамадстве.

У мэтах ацэнкі прафесійных схільнасцей і пераваг кожнага вучня, вызначэння яго будучай сферы прафесійнай дзейнасці і прыняцця ўсвядомленага рашэння аб выбары прафесіі варта арганізаваць прафарыентацыйнае тэсціраванне з выкарыстаннем анлайн-платформы «ПрофиТест» *(http://profitest.ripo.by/public/main)*.

Для інфармавання будучых абітурыентаў аб прафесіях і ўмовах паступлення варта выкарыстоўваць даведачны рэсурс для тых, хто паступае, – Абитуриент.by *(https://abiturient.by)*; для знаёмства вучняў з грамадзянска-патрыятычнымі, валанцёрскімі, сацыяльна значнымі і культурна-дасугавымі праектамі і мерапрыемствамі для моладзі – сайт Рэспубліканскага маладзёжнага цэнтра *(https://moladz.by)*.

Звяртаем увагу, што ва ўсіх УАСА ў трэцюю суботу кожнага месяца варта запланаваць правядзенне дня працоўнага выхавання і прафарыентацыі, у рамках якога арганізаваць тэматычныя сустрэчы з паспяховымі прадстаўнікамі прафесій, сямейных дынастый, пераможцамі конкурсаў прафесійнага майстэрства; арганізаваць выязныя мерапрыемствы на прадпрыемствы, у каледжы, установы вышэйшай адукацыі («Дзень з прадпрыемствам», «Адзін дзень у прафесіі» і г.д.).

**4.4. Фарміраванне навыкаў здаровага ладу жыцця і выхаванне культуры бяспекі жыццядзейнасці**

У новым навучальным годзе варта працягнуць работу па захаванні і ўмацаванні здароўя, развіцці навыкаў бяспечных і самазахавальных паводзін:

мерапрыемствы па навучанні навыкам бяспечных паводзін падчас дарожнага руху, у надзвычайных сітуацыях сумесна з супрацоўнікамі МНС, АСВОД (рэспубліканскія прафілактычныя акцыі «Бяспека – у кожны дом!», «Дзень бяспекі. Увага ўсім!» і інш.);

спартыўна-масавыя і фізкультурна-аздараўленчыя мерапрыемствы: «Тыдзень спорту і здароўя», «Вас выклікае Спартландыя!», «Снежны снайпер», рэспубліканская спартакіяда па зімовым і летнім мнагаборстве сярод моладзі дапрызыўнага і прызыўнога ўзросту «Абаронца Айчыны», спартакіяда вучняў па тэхнічных відах спорту «ТэхнаСпорт», турысцкія злёты вучняў, штомесячныя Дні здароўя (другая субота месяца);

мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне антынаркатычнага бар’ера, прафілактыку ўжывання псіхаактыўных рэчываў і курыльных сумесяў; прафілактыку тытунекурэння;

мерапрыемствы па прафілактыцы інтэрнэт-залежнасці, залежнасці ад гаджэтаў;

мерапрыемствы ў рамках міжнародных і рэспубліканскіх дзён здароўя (Сусветны дзень здароўя, Міжнародны дзень барацьбы з наркотыкамі, Міжнародны дзень прафілактыкі ВІЧ / СНІД і інш.).

Работу варта праводзіць ва ўзаемадзеянні з сацыяльнымі партнёрамі (установамі аховы здароўя) і законнымі прадстаўнікамі вучняў.

Пры арганізацыі работы ў гэтым напрамку варта выкарыстоўваць:

матэрыялы, размешчаныя на нацыянальным адукацыйным партале:

«Рэсурсныя цэнтры па здароўезберажэнні» (*https://adu.by/ru/component/content/article/zdorovesberezhenie-v-obrazovanii.html?catid=791&Itemid=101*);

«Актуальныя практыкі і тэхналогіі фарміравання здаровага ладу жыцця» (*https://vospitanie.adu.by/component/content/article/zdorovyj-obraz-zhizni.html?catid=22&Itemid=101*);

*інфармацыйныя рэсурсы:*

POMOGUT.BY: *https://pomogut.by*; *https://kidspomogut.by*;

Рэспубліканскі цэнтр псіхалагічнай дапамогі (*https://rcpp.by*);

Рэспубліканскі навукова-практычны цэнтр псіхічнага здароўя (*https://mentalhealth.by/pacientam/informacionno-obrazovatelnye-materialy-po-propagande-zozh*);

Рэспубліканскі цэнтр гігіены, эпідэміялогіі і грамадскага здароўя (*https://www.rcheph.by*);

Дзіцячы прававы сайт (*https://mir.pravo.by/edu/lichnaya-bezopasnost*).

Асаблівую ўвагу ва УАСА варта надаць удзелу ўсіх педагагічных работнікаў, законных прадстаўнікоў непаўналетніх у рабоце па прафілактыцы суіцыдальных паводзін вучняў.

Неабходна забяспечыць правядзенне заняткаў «Мой псіхалагічны дабрабыт і дапамога аднагодкам у крызіснай сітуацыі» са 100 % ахопам непаўналетніх вучняў IV–XI класаў УАСА на аснове прыкладных матрыц класных гадзін (*https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/informacionnie-i-klassnie-chasi.html*), адзінай інфармацыйнай гадзіны па прафілактыцы суіцыдальных паводзін вучняў УАСА ў

адпаведнасці з прыкладнай матрыцай (*https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/informacionnie-i-klassnie-chasi.html*).

З мэтай прафілактыкі такой негатыўнай з’явы сярод вучняў, як цкаванне, варта ўзмацніць работу па стварэнні ва УАСА сяброўскага і падтрымліваючага асяроддзя, а менавіта:

актывізаваць дзейнасць ва ўзаемадзеянні з зацікаўленымі суб’ектамі прафілактыкі па інфармаванні бацькоў вучняў аб прычынах, прыкметах і наступствах цкавання дзяцей, у тым ліку ў інтэрнэце;

забяспечыць правядзенне класнымі кіраўнікамі мерапрыемстваў, накіраваных на згуртаванне калектыву і ўмацаванне сяброўскіх сувязей вучняў, фарміраванне ў іх паважлівага стаўлення да аднагодкаў, дарослых, умення канструктыўна вырашаць канфлікты, распазнаваць маніпуляцыі і супраціўляцца негатыўнаму ўплыву.

Пры арганізацыі работы ў гэтых напрамках могуць быць выкарыстаны матэрыялы, размешчаныя:

на нацыянальным адукацыйным партале ў раздзеле «Арганізацыя выхавання» (*https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/informacionnie-i-klassnie-chasi.html*);

на сайце Акадэміі адукацыі ў Рэспубліканскай сеткавай кансультацыйна-метадычнай лабараторыі «Кропка росту» (*https://do.academy.edu.by/course/view.php?id=149#section-12*);

на сайце Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі (*https://rcpp.by*);

на сайце Інстытута псіхалогіі БДПУ імя Максіма Танка (*https://ipsy.bspu.by/pedagogical-psychology*).

Неабходна актывізаваць работу па інфармаванні вучняў і іх бацькоў аб «Тэлефонах даверу»:

рэспубліканскай «Дзіцячай тэлефоннай лініі» (8 801 100 16 11);

Рэспубліканскага цэнтра псіхалагічнай дапамогі (+375 17 300 10 06);

Цэнтра экстранай псіхалагічнай дапамогі (133);

кабінетаў псіхалагічнага і (або) псіхатэрапеўтычнага кансультавання ўстаноў аховы здароўя (паліклінік).

**4.5. Фарміраванне прававой і інфармацыйнай культуры**

У 2025/2026 навучальным годзе варта працягнуць работу па фарміраванні прававой культуры вучняў і іх бацькоў у адпаведнасці з Планам мерапрыемстваў па прававым выхаванні і асвеце грамадзян у 2024–2029 гадах (пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 12.01.2024 № 24 «Аб прававым выхаванні і асвеце грамадзян у 2024–2029 гадах», сумесным Планам мерапрыемстваў Міністэрства адукацыі і Цэнтральнай выбарчай камісіі па павышэнні прававой культуры моладзі на 2024–2025 гады. З гэтай мэтай неабходна:

працягнуць правядзенне інфармацыйных гадзін з вучнямі IX–XI класаў па пытаннях выбарчага права *(адзін раз на чвэрць).* Для правядзення інфармацыйных гадзін неабходна выкарыстоўваць дапаможнік «Избирательное право» (Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2024); матрыцы, размешчаныя на нацыянальным адукацыйным партале *(https://vospitanie.adu.by/images/2024/08/Matricy-izbiratelnoe-pravo-2024.pdf)*; матэрыялы, размешчаныя на Дзіцячым прававым сайце *(https://mir.pravo.by/edu/detyam-o-vyborakh)*;

прыцягнуць вучняў X–XI класаў да ўдзелу ў рэспубліканскай алімпіядзе па пытаннях тэорыі і практыкі выбарчага працэсу *(https://olimp.adu.by)*;

запланаваць правядзенне ва УАСА тыдняў, месячнікаў (дэкад) прававых ведаў;

працягнуць рэалізацыю вучэбных праграм факультатыўных заняткаў прававой накіраванасці: «Правілы ў маім жыцці» (II–IV класы), «Вучымся жыць у міры і згодзе» (V–VIII класы), «Будучыня пачынаецца сёння» (III (IV), V (VI), VII (VIII) класы), «Асновы права» (X–XI класы);

распрацаваць і ўкараніць праграмы аб’яднанняў па інтарэсах прававой накіраванасці;

забяспечыць своечасовае абнаўленне на інфармацыйных стэндах, афіцыйных сайтах УАСА прававой інфармацыі для вучняў і іх законных прадстаўнікоў;

забяспечыць выкананне комплекснага плана мерапрыемстваў, накіраваных на прыняцце эфектыўных мер па супрацьдзеянні кіберзлачынствам, прафілактыцы іх здзяйснення, павышэнню лічбавай адукаванасці насельніцтва на 2024–2025 гады, ад 15.11.2023: размяшчаць інфармацыю па папярэджанні кіберзлачынстваў, пытаннях бяспечнага выкарыстання інтэрнэт-рэсурсаў; запланаваць мерапрыемствы, накіраваныя на фарміраванне навыкаў бяспечных паводзін у інтэрнэт-прасторы, уменняў дасканала працаваць з інфармацыяй, медыякампетэнцый, крытычнага мыслення пры выкарыстанні інфармацыйных рэсурсаў; выключыць выпадкі размяшчэння неактуальнай даведачнай інфармацыі, а таксама даведачнай інфармацыі, якая змяшчае адсылкі да няўрадавых арганізацый.

Пры арганізацыі работы ў гэтым напрамку можна выкарыстоўваць:

інфармацыю, размешчаную на інтэрнэт-партале «Моладзь Беларусі» *(https://xn--d1acdremb9i.xn--90ais)*;

інфармацыйныя матэрыялы сайта МУС *(https://mvd.gov.by/ru/news/7021, https://mvd.gov.by/ru/news/10738)*;

матэрыялы інтэрнэт-партала POMOGUT.BY (раздзел «Бяспека дзяцей у Сетцы»);

інфармацыйна-даведачныя матэрыялы і рэкамендацыі па выкарыстанні на розных прыладах (камп’ютарах, мабільных тэлефонах, планшэтах, IPTV) спецыяльных праграм, якія забяспечваюць магчымасць бацькам кантраляваць інфармацыйныя рэсурсы, што наведваюць дзеці, час іх знаходжання ў сетцы Інтэрнэт (пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 21.06.2024 № 06-01-14/7321/дс/);

метадычныя матэрыялы (*https://disk.yandex.by/d/F03-laudj7830g*).

**4.6. Духоўна-маральнае выхаванне**

Ва УАСА варта працягнуць рэалізацыю факультатыўных заняткаў «Асновы духоўна-маральнай культуры і патрыятызму» для вучняў V–IX класаў. Змест факультатыўных заняткаў можна выкарыстоўваць таксама пры правядзенні пазакласных мерапрыемстваў па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні.

Рэкамендуецца працягнуць практыку ўзаемадзеяння з Беларускай праваслаўнай царквой па выкарыстанні патэнцыялу традыцыйных ідэалаў і каштоўнасцей у духоўна-маральным выхаванні вучняў; праводзіць работу па рэалізацыі мерапрыемстваў Праграмы супрацоўніцтва Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь і Беларускай праваслаўнай царквы на 2020–2025 гады, грунтуючыся на заканадаўстве Рэспублікі Беларусь у гэтай сферы.

Работа рэсурсных цэнтраў па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні вучняў ва ўстановах адукацыі павінна весціся з улікам адзіных падыходаў і патрабаванняў, выпрацаваных Рэспубліканскім рэсурсным цэнтрам па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні.

Для педагагічных работнікаў, якія забяспечваюць дзейнасць рэсурсных цэнтраў па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні, ДУА «Акадэмія адукацыі» правядзе ў кастрычніку – снежні 2025 года павышэнне кваліфікацыі «Эфектыўныя формы і метады работы рэсурсных цэнтраў па духоўна-маральным і патрыятычным выхаванні вучняў».

**4.7. Эканамічнае выхаванне**

З мэтай фарміравання эканамічнай культуры вучняў рэкамендуецца выкарыстоўваць:

УМК факультатыўных заняткаў:

«Когда учиться легко. В мире финансов» для III–IV класаў (*https://www.adu.by/ru/component/content/article/fakultativnye-zanyatiya-kogda-uchitsya-legko-v-mire-finansov-dlya-iii-iv-klassov.html?catid=778&Itemid=101*);

«Предпринимательство в действии» для X класа (*https://www.adu.by/ru/component/content/article/fakultativnye-zanyatiya-predprinimatelstvo-v-dejstvii-dlya-x-klassa.html?catid=778&Itemid=101*);

Метадычныя рэкамендацыі, распрацаваныя Нацыянальным банкам Рэспублікі Беларусь (*https://fingramota.by/ru/about/events/olympiadas?cookies=true*).

Варта працягнуць работу па павышэнні фінансавай адукаванасці вучняў, прыцягненні іх да ўдзелу ў рэспубліканскай алімпіядзе па фінансавай адукаванасці.

**4.8. Фарміраванне ў вучняў беражлівых адносін да навакольнага асяроддзя і прыродакарыстання**

З мэтай фарміравання экалагічнай культуры вучняў рэкамендуецца:

уключаць вучняў у рэалізацыю адукацыйнага праекта «Зялёныя школы» (*https://drive.google.com/file/d/1oewYvCyUYRjfeYtMbJx54zuomi-fjnPw/view*);

прыняць удзел у рэспубліканскай дабрачыннай акцыі «Сад надзеі» (*https://rcek.by/respublikanskaya-blagotvoritelnaya-aktsiya-sad-nadezhdy*);

арганізаваць правядзенне факультатыўных заняткаў:

«Аблічча Беларусі: экалогія і ўстойлівасць» для IX класа (*https://www.adu.by/ru/component/content/article/fakultativnye-zanyatiya-lik-belarusi-ekologiya-i-ustojchivost-dlya-ix-klasca.html?catid=778&Itemid=101*);

«Экалагічная бяспека і здароўе чалавека» для VIII–XI класаў (*https://www.adu.by/ru/component/content/article/fakultativnye-zanyatiya-ekologicheskaya-bezopasnost-i-zdorove-cheloveka-dlya-viii-xi-klascov.html?catid=778&Itemid=101*);

працягнуць работу па зборы вучнямі макулатуры і іншай другаснай сыравіны, элементаў сілкавання (батарэек).

**4.9. Сацыяльна-педагагічная падтрымка навучэнцаў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі**

Дзейнасць педагога-псіхолага і педагога сацыяльнага (далей – спецыялісты) ажыццяўляецца ва УАСА ў адпаведнасці з Інструкцыяй аб парадку сацыяльна-педагагічнай падтрымкі і аказання псіхалагічнай дапамогі, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.06.2025 №113 (далей – Інструкцыя).

Важнай умовай забеспячэння вырашэння задач прафесійнай дзейнасці спецыялістаў з'яўляецца ўлік імі ўмоў функцыянавання ўстановы адукацыі, асаблівасцей кантынгенту ўдзельнікаў адукацыйнага працэсу.

Асаблівую ўвагу спецыялістам неабходна звярнуць на эфектыўнасць рэалізацыі прынцыпу інтэграцыі відаў дзейнасці, якая ажыццяўляецца імі.

Звяртаем увагу, дзейнасць па сацыяльна-педагагічнай падтрымцы вучняў і аказанні ім псіхалагічнай дапамогі ажыццяўляецца спецыялістамі ў асобна выдзеленых рабочых кабінетах, аснашчаных мэбляй, інвентаром, сродкамі навучання ў адпаведнасці з прынцыпамі, відамі і задачамі іх дзейнасці.

Інфармацыя аб арганізацыі дзейнасці спецыялістаў павінна быць размешчана на інфармацыйных стэндах і афіцыйным сайце ўстановы адукацыі; графік работы, зацверджаны кіраўніком установы адукацыі, – пры ўваходзе ў рабочы кабінет спецыяліста.

Рэжым працоўнага часу спецыялістаў павінен быць урэгуляваны Правіламі ўнутранага працоўнага распарадку ва ўстанове адукацыі (далей – Правілы) з улікам выканання індывідуальнай і групавой работы па відах ажыццяўляемай дзейнасці ў межах не менш за палову тыднёвай працягласці іх працоўнага часу.

Пры планаванні дзейнасці спецыялістаў кіраўніцтву ўстановы адукацыі варта ўлічыць, што час на падрыхтоўку да выканання работы, наведванне заняткаў і іншых форм арганізацыі адукацыйнага працэсу, наведванне вучняў дома, апрацоўку, аналіз і абагульненне атрыманых вынікаў, запаўненне дакументаў, а таксама павышэнне свайго прафесійнага ўзроўню ў адпаведнасці з пунктам 11 Інструкцыі павінна быць ўрэгулявана Правіламі.

Абавязковымі да ўстанаўлення ў плане работы спецыялістаў з’яўляюцца мерапрыемствы, накіраваныя на садзейнічанне вучням у адаптацыі да новых умоў навучання і выхавання.

Накіраванасць мерапрыемстваў плана работы спецыялістаў падрабязна адлюстравана ў пункце 15 Інструкцыі.

Звяртаем увагу, у пунктах 12, 13 Інструкцыі замацаваны пералік дакументаў, абавязковых для вядзення педагогам сацыяльным, педагогам-псіхолагам. На афіцыйным сайце Акадэміі адукацыі размешчаны формы плана работы на паўгоддзе і журнал уліку мерапрыемстваў (*https://www.akademy.by/index.php/ru/metodic/metodicheskoe-soprovozhdenie/32-metod-deyatelnost/metod-sopr-vosp-raboty/197-opp*).

Матэрыялы па суправаджэнні дзейнасці спецыялістаў размешчаны на афіцыйным сайце Акадэміі адукацыі (*https://www.akademy.by/index.php/ru/metodic/metodicheskoe-soprovozhdenie/32-metod-deyatelnost/metod-sopr-vosp-raboty/197-opp*).

**4.10. Прафілактыка злачынстваў і правапарушэнняў**

У 2025/2026 навучальным годзе неабходна працягнуць сістэмную работу па прафілактыцы супрацьпраўных паводзін вучняў ва ўзаемадзеянні з праваахоўнымі органамі, спецыялістамі аховы здароўя, святарамі Беларускай праваслаўнай царквы, грамадскімі аб’яднаннямі і іншымі зацікаўленымі.

У рабоце па прафілактыцы супрацьпраўных паводзін вучняў неабходна забяспечыць дысцыпліну і парадак ва ўстанове адукацыі, своечасовае выяўленне і ліквідацыю прычын і ўмоў здзяйснення супрацьпраўных дзеянняў непаўналетнімі ў адпаведнасці з комплексам мер па падтрыманні дысцыпліны і правапарадку ва ўстановах адукацыі,

прафілактыцы супрацьпраўных паводзін непаўналетніх на 2024–2026 гады.

З мэтай прафілактыкі злачынстваў і правапарушэнняў непаўналетніх неабходна:

выкарыстоўваць патэнцыял сістэмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (аб’яднанняў па інтарэсах) у адпаведнасці з устаноўленымі нарматывамі колькасці;

ажыццяўляць кансультаванне па прававых пытаннях: растлумачваць вучням, іх законным прадстаўнікам правы, абавязкі і адказнасць, якія яны маюць;

аказваць садзейнічанне ў вызначэнні форм працоўнага і жыццёвага ўладкавання, арганізацыі вольнага часу і занятасці непаўналетніх, якія маюць патрэбу ў дапамозе дзяржавы.

Пры арганізацыі прафілактычнай работы з вучнямі і законнымі прадстаўнікамі варта выкарыстоўваць афіцыйныя крыніцы прававой інфармацыі: эталонны банк даных прававой інфармацыі Рэспублікі Беларусь (*www.etalonline.by*); Дзіцячы прававы сайт (*http://www.mir.pravo.by*); сайт *http://pomogut.by*; сайт *http://kids.pomogut.by*, створаны для абароны дзяцей ад булінгу, грумінгу і распаўсюджвання наркотыкаў з дапамогай сеткі Інтэрнэт.

На асаблівым кантролі адміністрацыі УАСА павінны знаходзіцца пытанні прафілактыкі ўжывання вучнямі псіхаактыўных рэчываў, procідзеяння ўключэнню іх у здзяйсненне нарказлачынстваў (з улікам комплекснага плана мерапрыемстваў па прафілактыцы наркаманіі і супрацьдзеянні незаконнаму абароту наркотыкаў, сацыяльнай рэабілітацыі нарказалежных асоб на 2025–2026 гады, зацверджанага намеснікам Прэм’ер-міністра Рэспублікі Беларусь 27.02.2025 № 33/202-55).

Метадычныя рэкамендацыі па правядзенні тэматычных бацькоўскіх сходаў па інфармаванні аб прыметах ужывання альбо распаўсюджвання наркотыкаў, сучасных спосабах уключэння вучняў у наркаабарот, мерах крымінальнай адказнасці і інш. размешчаны на нацыянальным адукацыйным партале (*https://vospitanie.adu.by/profilaktika-prestuplenij-i-pravonarushenij-sredi-obuchauschihsya.html*).

У прафілактычнай рабоце варта арганізоўваць удзел вучняў у валанцёрскіх адукацыйных праграмах сумесна з ГА «БРСМ», ГА «БРПА», Беларускай праваслаўнай царквой і інш.

Работу савета прафілактыкі ва УАСА неабходна арганізоўваць у строгай адпаведнасці з Метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі дзейнасці савета ўстановы адукацыі па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх (*https://vospitanie.adu.by/organizatsiya-vospitaniya/metodicheskie-rekomendatsii.html*).

Звяртаем увагу, што ў Палажэнне аб савеце ўстановы адукацыі па прафілактыцы безнагляднасці і правапарушэнняў непаўналетніх (зацверджана пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 27.11.2017 № 146) унесена змяненне пастановай Міністэрства адукацыі ад 28.01.2025 № 24, якое прадугледжвае разгляд на саветах прафілактыкі пытанняў па стварэнні выхоўваючага асяроддзя, якое спрыяе зніжэнню колькасці правапарушэнняў, а таксама перашкаджае распаўсюджванню ў маладзёжным асяроддзі негатыўных сацыяльных з’яў.

Пры арганізацыі індывідуальнай прафілактычнай работы з вучнямі неабходна кіравацца Метадычнымі рэкамендацыямі па арганізацыі ва ўстановах адукацыі індывідуальнай прафілактычнай работы з вучнямі (*https://www.adu.by/images/2024/05/23/Metod-rekomend-profilakt-rabota-2024.pdf*). Праграма індывідуальнай прафілактычнай работы, якая распрацоўваецца ва УАСА, павінна прадугледжваць ўцягванне непаўналетняга і яго атачэння ў працэс пераадолення праблемнай сітуацыі, стварэнне ўмоў для асваення вучнем пазітыўнага вопыту вырашэння праблем. Мерапрыемствы праграмы, праведзеныя класнымі кіраўнікамі, рэгіструюцца ў класным журнале. Асаблівую ўвагу трэба надаць часовай працоўнай занятасці вучняў, з якімі праводзіцца індывідуальная прафілактычная работа, у вольны ад вучобы час.

На афіцыйных сайтах устаноў адукацыі варта размясціць спасылку на раздзел «Моладзь супраць наркотыкаў» дзяржаўнага інфармацыйнага рэсурсу «Моладзь Беларусі», дзе публікуюцца інфармацыйныя матэрыялы, відэаролікі, накіраваныя на прафілактыку незаконнага абароту наркотыкаў і арыентаваныя на маладзёжную аўдыторыю (*https://xn--d1acdremb9i.xn--90ais/informatsiya-po-vazhnym-voprosam/uchashcheysya-i-studencheskoy-molodyezhi/molodyezh-protiv-narkotikov/?ysclid=lwelg97u5e288187294*).

З мэтай прафілактыкі злачынстваў у сферы незаконнага абароту наркотыкаў педагагічным работнікам устаноў адукацыі варта падпісацца на канал «STOP наркотик! (Республика Беларусь)» для своечасовага інфармавання вучняў, іх законных прадстаўнікоў (*https://t.me/s/stop_drug_by*).

Варта актывізаваць прафілактычную работу з навучэнцамі ў канікулярны перыяд, у тым ліку праз акцыі «Інфабус – жыццё без наркотыкаў», «Правільнае лета», «ПраЗдароўе», якія праводзяцца сумесна са спецыялістамі МУС, аховы здароўя, МНС, пракуратуры.

Для павышэння эфектыўнасці прафілактычнай работы ў сферы незаконнага абароту наркотыкаў ва УАСА неабходна:

рэалізоўваць актыўную антынаркатычную прафілактыку, выкарыстоўваючы папулярныя ў падлеткаў і моладзі сацыяльныя сеткі і месенджары;

сістэмна праводзіць мерапрыемствы, накіраваныя на інфармаванне вучняў аб адміністрацыйнай і крымінальнай адказнасці і наступствах іх уцягвання ў незаконны абарот наркотыкаў;

арганізаваць наведванне вучнямі рэгіянальных антынаркатычных пляцовак (цэнтраў прафілактыкі), прысвечаных негатыўным сацыяльным і медыцынскім наступствам наркаманіі і барацьбе з распаўсюджваннем наркотыкаў.

У рамках правядзення прафілактычнай работы неабходна даводзіць да ведама вучняў інфармацыю аб адказнасці за курэнне (спажыванне) тытунёвых вырабаў, выкарыстанне электронных сістэм курэння, сістэм для спажывання тытуню ў адпаведнасці з артыкулам 118 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, артыкулам 19.9 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адміністрацыйных правапарушэннях.

Асаблівую ўвагу ва УАСА неабходна надаць рабоце, накіраванай на прафілактыку экстрэмізму ў маладзёжным асяроддзі, якая арганізуецца ва ўзаемадзеянні з праваахоўнымі органамі. У рамках дадзенай работы варта інфармаваць вучняў аб адміністрацыйнай адказнасці за ўдзел у несанкцыянаваных публічных мерапрыемствах, парушэнне грамадскага парадку; аб крымінальнай адказнасці за ўчыненне злачынстваў і правапарушэнняў экстрэмісцкай накіраванасці. Неабходна вучыць непаўналетніх процідзейнічаць распаўсюджванню матэрыялаў, у якіх утрымліваецца пагроза і падбухторванне да гвалтоўных дзеянняў у дачыненні да асоб іншай нацыянальнасці, расы, рэлігійнай прыналежнасці, а таксама заахвочванне, апраўданне генацыду, рэпрэсій у дачыненні да прадстаўнікоў якой-небудзь нацыі. Рэкамендуецца арганізаваць прагляд і абмеркаванне з вучнямі X–XI класаў фільма-расследавання АНТ «Убойная посылка», у якім асвятляюцца падрабязнасці спецаперацыі Камітэта дзяржаўнай бяспекі па прадухіленні тэрактаў у Беларусі напярэдадні святкавання Дня Перамогі: (*https://ont.by/news/film-ubojnaya-posylka-ont-gotovit-specrassledovanie-o-popytkah-teraktov-v-belarusi-v-preddverii-9-maya*).

Пытанні якасці арганізацыі прафілактычнай работы з вучнямі павінны штогод разглядацца на педагагічных саветах, нарадах пры дырэктару, намесніку дырэктара па выхаваўчай рабоце.

ДАДАТАК 1

## Цыклаграма мерапрыемстваў па ідэалагічнай рабоце з працоўным калектывам на 2025/2026 навучальны год*

<table>
<tr><th rowspan="2">Форма правядзення мерапрыемстваў</th><th colspan="5">Перыяд правядзення</th></tr>
<tr><th>верасень</th><th>кастрычнік</th><th>лістапад</th><th>снежань</th><th>студзень</th></tr>
<tr><td>У першым паўгоддзі</td><td colspan="5">Мерапрыемствы, прымеркаваныя да Года добраўпарадкавання.<br>Арганізацыя, правядзенне, удзел і асвятленне мерапрыемстваў, прымеркаваных да 80-й гадавіны Перамогі ў Вялікай Айчыннай вайне.<br>Арганізацыя і правядзенне экскурсійных праграм па гістарычных мясцінах Беларусі, уключаючы мемарыяльныя комплексы, месцы баявой і партызанскай славы, пахаванняў ахвяр генацыду беларускага народа, славутасці і святыні, а таксама музеі Беларусі.<br>Арганізацыя ў працоўным калектыве прагляду мастацкіх і дакументальных фільмаў з мэтай патрыятычнага выхавання насельніцтва, захавання гістарычнай памяці.<br>Арганізацыя ў працоўным калектыве дыялогавых пляцовак, круглых сталоў з прадстаўнікамі грамадскіх аб’яднанняў, палітычных партый</td></tr>
<tr><td rowspan="2">Адзіныя дні інфармавання (штомесяц)</td><td>Дзень народнага адзінства<br>(17 верасня)</td><td></td><td>Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі<br>(7 лістапада)</td><td></td><td></td></tr>
<tr><td colspan="5">Тэматычны банк даных «Ідэалагічная работа», размешчаны ў інфармацыйна-пошукавай сістэме «ЭТАЛОН-ONLINE»</td></tr>
<tr><td>Тэматычныя сустрэчы кіраўніцтва з калектывам работнікаў</td><td>Статус педагога. Імідж педагога</td><td>Абмеркаванне пытанняў сямейнага выхавання</td><td>Інфармацыйная бяспека</td><td>Падвядзенне вынікаў Года добраўпарадкаван ня</td><td>Новы год – новыя задачы</td></tr>
<tr><td>Дэкады (тыдні)</td><td></td><td>Тыдзень бацькоўскай любові<br>(14–21 кастрычніка)</td><td></td><td></td><td></td></tr>
</table>

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| **Акцыі** | | Да Дня маці (14 кастрычніка). Да Дня бацькі (21 кастрычніка) | | «Нашы дзеці» | «Ад усёй душы» |
| **Форма правядзення мерапрыемстваў** | **Перыяд правядзення** | | | | |
| | **люты** | **сакавік** | **красавік** | **май** | **чэрвень – ліпень** |
| **У другім паўгоддзі** | Правядзенне мерапрыемстваў (урачыстыя сходы, канцэрты, выставы і інш.), прысвечаных дзяржаўным святам, святочным дням і памятным датам у Рэспубліцы Беларусь.<br>Арганізацыя і правядзенне экскурсійных праграм па гістарычных мясцінах Беларусі, уключаючы мемарыяльныя комплексы, месцы баявой і партызанскай славы, славутасці і святыні Беларусі, музеі Беларусі.<br>Арганізацыя ў працоўным калектыве прагляду мастацкіх і дакументальных фільмаў з мэтай патрыятычнага выхавання насельніцтва, захавання гістарычнай памяці.<br>Арганізацыя ў працоўным калектыве дыялогавых пляцовак, круглых сталоў з прадстаўнікамі грамадскіх аб'яднанняў, палітычных партый | | | | |
| **Адзіныя дні інфармавання (штомесяц)** | Тэматычны банк даных «Ідэалагічная работа», размешчаны ў інфармацыйна-пошукавай сістэме «ЭТАЛОН-ONLINE» | | | | |
| **Тэматычныя сустрэчы кіраўніцтва з калектывам работнікаў** | | Дзень Канстытуцыі (15 сакавіка). 83-я гадавіна трагедыі ў Хатыні (22 сакавіка) | Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі (2 красавіка) | Дзень працы (1 мая). 81-я гадавіна Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (9 мая). Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага | Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа (22 чэрвеня). Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) (3 ліпеня) |

| | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| | | | | гімна Рэспублікі Беларусь (другая нядзеля мая). Дзень сям'і (15 мая) | |
| **Дэкады (тыдні)** | Дэкада мужнасці, прысвечаная Дню памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў (15 лютага) | | | – | Дэкада грамадска-значных спраў да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь «Захоўваем мінулае, цэнім сучаснасць. Будуем будучыню!» |
| **Акцыі** | Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь (23 лютага) | Дзень жанчын (8 сакавіка) | Арганізацыя, правядзенне і ўдзел у рэспубліканскім суботніку | Рэспубліканская акцыя «Беларусь памятае». Рэспубліканская героіка-патрыятычная акцыя «Вялікай Перамозе – 81!» | Рэспубліканская акцыя «Праспяваем гімн разам» |

**** Установа адукацыі ў канікулярны перыяд працуе згодна з зацверджаным планам***

**Дадатак 2**

КАЛЯНДАР
дзяржаўных свят,
святочных дзён, памятных і святочных дат

## I. Дзяржаўныя святы, святочныя дні, памятныя даты ў Рэспубліцы Беларусь

ДЗЯРЖАЎНЫЯ СВЯТЫ
Дзень Канстытуцыі – 15 сакавіка;
Дзень яднання народаў Беларусі і Расіі – 2 красавіка;
Дзень Перамогі – 9 мая;
Дзень Дзяржаўнага сцяга, Дзяржаўнага герба і Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусь – другая нядзеля мая;
Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь (Дзень Рэспублікі) – 3 ліпеня;
Дзень народнага адзінства – 17 верасня.

АГУЛЬНАРЭСПУБЛІКАНСКІЯ СВЯТОЧНЫЯ ДНІ
Новы год – 1 і 2 студзеня;
Дзень абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь – 23 лютага;
Дзень жанчын – 8 сакавіка;
Свята працы – 1 мая;
Дзень Кастрычніцкай рэвалюцыі – 7 лістапада.

ПРАФЕСІЙНЫЯ І ІНШЫЯ СВЯТОЧНЫЯ ДНІ
Дзень ратавальніка – 19 студзеня;
Дзень беларускай навукі – апошняя нядзеля студзеня;
Дзень друку – 5 мая;
Дзень сям'і – 15 мая;
Дзень піянерскай дружбы – 19 мая;
Дзень моладзі і студэнцтва – апошняя нядзеля чэрвеня;
Дзень ведаў – 1 верасня;
Дзень беларускага пісьменства – першая нядзеля верасня;
Дзень бібліятэк – 15 верасня;
Дзень пажылых людзей – 1 кастрычніка;
Дзень настаўніка – першая нядзеля кастрычніка;
Дзень маці – 14 кастрычніка;
Дзень бацькі – 21 кастрычніка;
Дзень інвалідаў Рэспублікі Беларусь – 3 снежня;
Дзень беларускага кіно – 17 снежня.

ПАМЯТНЫЯ ДАТЫ
Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў – 15 лютага;
Дзень чарнобыльскай трагедыі – 26 красавіка;

Дзень усенароднай памяці ахвяр Вялікай Айчыннай вайны і генацыду беларускага народа – 22 чэрвеня.

**II. Святочныя даты (міжнародныя дні, заснаваныя ААН, іншымі арганізацыямі, грамадскімі аб'яднаннямі)**

Сусветны дзень запаведнікаў і нацыянальных паркаў – 11 студзеня;
Дзень юнага героя-антыфашыста – 8 лютага;
Міжнародны дзень роднай мовы – 21 лютага;
Міжнародны дзень барацьбы з наркаманіяй і незаконным абаротам наркотыкаў – 1 сакавіка;
Сусветны дзень дзікай прыроды – 3 сакавіка;
Сусветны дзень паэзіі – 21 сакавіка;
Міжнародны дзень лясоў – 21 сакавіка;
Сусветны дзень водных рэсурсаў – 22 сакавіка;
Сусветны дзень тэатра – 27 сакавіка;
Міжнародны дзень дзіцячай кнігі – 2 красавіка;
Міжнародны дзень спорту на карысць развіцця і міру – 6 красавіка;
Сусветны дзень здароўя – 7 красавіка;
Міжнародны дзень вызвалення вязняў канцлагераў – 11 красавіка;
Міжнародны дзень палёту чалавека ў космас – 12 красавіка;
Міжнародны дзень культуры – 15 красавіка;
Міжнародны дзень помнікаў і гістарычных мясцін – 18 красавіка;
Міжнародны дзень Зямлі – 22 красавіка;
Сусветны дзень кнігі і аўтарскага права – 23 красавіка;
Сусветны дзень аховы працы – 28 красавіка;
Міжнародны дзень музеяў – 18 мая;
Сусветны дзень культурнай разнастайнасці ў імя дыялогу і развіцця – 21 мая;
Міжнародны дзень біялагічнай разнастайнасці – 22 мая;
Сусветны дзень без тытуню – 31 мая;
Міжнародны дзень абароны дзяцей – 1 чэрвеня;
Сусветны дзень навакольнага асяроддзя – 5 чэрвеня;
Дзень юннатаўскага руху – 15 чэрвеня;
Міжнародны дзень барацьбы са злоўжываннем наркатычнымі сродкамі і іх незаконным абаротам – 26 чэрвеня;
Міжнародны дзень дружбы – 30 ліпеня;
Сусветны дзень барацьбы з гандлем людзьмі – 30 ліпеня;
Міжнародны дзень моладзі – 12 жніўня;
Міжнародны дзень дабрачыннасці – 5 верасня;
Міжнародны дзень пісьменнасці – 8 верасня;
Міжнародны дзень аховы азонавага слоя – 16 верасня;
Міжнародны дзень міру – 21 верасня;
Сусветны дзень турызму – 27 верасня;
Міжнародны дзень пажылых людзей – 1 кастрычніка;
Міжнародны дзень музыкі – 1 кастрычніка;
Сусветны дзень абароны жывёл – 4 кастрычніка;

Сусветны дзень настаўніка – 5 кастрычніка;
Міжнародны дзень школьных бібліятэк – чацвёрты панядзелак кастрычніка;
Сусветны дзень навукі за мір і развіццё – 10 лістапада;
Міжнародны дзень энергазберажэння – 11 лістапада;
Сусветны дзень дзіцяці – 20 лістапада;
Сусветны дзень барацьбы са СНІДам – 1 снежня;
Міжнародны дзень інвалідаў – 3 снежня;
Міжнародны дзень добраахвотнікаў у імя эканамічнага і сацыяльнага развіцця (Сусветны дзень валанцёраў) – 5 снежня;
Сусветны дзень правоў чалавека – 10 снежня.

**III. Юбілейныя даты, якія будуць адзначацца ў 2025/2026 навучальным годзе:**

**24 кастрычніка** – 80 гадоў са дня заснавання Арганізацыі Аб’яднаных Нацый;
**15 лістапада** – 100 гадоў беларускаму радыё;
**26 лістапада** – 95 гадоў са дня нараджэння Уладзіміра Караткевіча;
**20 снежня** – 80 гадоў з пачатку выдання «Настаўніцкай газеты»;
**1 студзеня** – 70 гадоў са дня правядзення першай тэлеперадачы ў Беларусі;
**5 сакавіка** – 130 гадоў са дня нараджэння Кандрата Крапівы.

**Дадатак 3**

# ЦЫКЛАГРАМА
## мерапрыемстваў выхаваўчай накіраванасці з вучнямі ўстаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, на 2025/2026 навучальны год

| Месяц | Тыдні | Адзіныя ўрокі | Дэкады (тыдні) | Акцыі, праекты, конкурсы і інш. | Інфармацыйныя гадзіны | Класныя гадзіны |
|---|---|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| **Верасень** | 01–07.09 | Адзіны ўрок, прысвечаны Дню ведаў (1 верасня) | Тыдзень устаноў дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі | Рэспубліканская дабрачынная акцыя «У школу з добрым сэрцам» (ГА «БРСМ», жнівень – верасень).<br><br>Рэспубліканскі піянерскі марафон «Вандруй з БРПА» (верасень 2025 – май 2026).<br><br>VII Рэспубліканскі конкурс лідараў ГА «БРПА» «Вектар поспеху» (верасень – кастрычнік).<br><br>Рэспубліканскія ваенна-патрыятычныя гульні «Зарнічка», «Зарніца», «Арляня» (ГА «БРПА», ГА «БРСМ», верасень 2025 – чэрвень 2026) | | |
| | 08–14.09 | | Тыдзень спорту і здароўя | Акцыі па ўступленні вучняў у шэрагі ГА«БРПА», ГА «БРСМ» | Інфармацыйная гадзіна з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | Класныя гадзіны «Мой псіхалагічны дабрабыт» |
| | 15–21.09 | Адзіны ўрок, прысвечаны Дню народнага адзінства (17 верасня) | | Рэспубліканская працоўная акцыя ГА «БРПА» «Зробім свет чысцейшым!» (верасень 2025 – май 2026).<br><br>Рэспубліканскі конкурс «Моладзь за чысціню гарадоў і вёсак» (верасень – кастрычнік) | Адзіны інфармацыйны гадзіну па прафілактыцы суіцыдальных паводзін «Псіхалагічны дабрабыт падлеткаў» | Тэматычныя заняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям'я. Мая Радзіма» |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | (https://ipsy.bspu.by/pedagogical-psychology/resursy) | |
| | 22–28.09 | | | Рэспубліканскі конкурс на лепшы тэрытарыяльны савет ГА «БРПА» (да 01 студзеня 2026 года)<br><br>Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Мы выбіраем дапамогу пажылым людзям», у тым ліку «Эстафета цеплыні», «Эстафета дабрыні» (ГА «БРСМ»)<br><br>Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | ШАГ | |
| **Кастрычнік** | 29.09–05.10 | | | Рэспубліканскі акцябрацкі маршрут «Тэрыторыя дзяцінства»  (ГА «БРПА», кастрычнік 2025 – май 2026) | | |
| | 06–12.10 | | | Рэспубліканскі дыстанцыйны цімураўскі праект «Цімураўцы.by» (ГА «БРПА», кастрычнік 2025 – май 2026).<br><br>Рэспубліканскі праект піянерскіх даручэнняў «Тэрыторыя лідараў» (кастрычнік 2025 – май 2026) | Інфармацыйныя гадзіны з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | Класныя гадзіны «Мой псіхалагічны дабрабыт» |
| | 13–19.10 | | Тыдзень бацькоўскай любові | Рэспубліканскі конкурс навукова-папулярнага відэа «Тэрыторыя ведаў» (ГА «БРПА», кастрычнік 2025 – май 2026) | Інфармацыйная гадзіна «Выбарчае права. З гісторыі выбарчага права» (IX–XI класы) | Тэматычныя заняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям'я. Мая Радзіма» |
| | 20–26.10 | | | | ШАГ | |
| | 27.10–02.11 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | | |
| **Лістапад** | 03–09.11 | **Восеньскія канікулы 02–09.11.2025** | | | | |
| | 10–16.11 | | | Рэспубліканскі конкурс на стварэнне квэстаў, | | Класныя гадзіны |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | размалёвак для акцябрат, анлайн-праектаў, анлайн-віктарын «Піянерская пракачка» (да 31 снежня 2026 г.) | | «Мой псіхалагічны дабрабыт» |
| | 17–23.11 | | | | Інфармацыйная гадзіна з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | Тэматычныя заняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям'я. Мая Радзіма» |
| | 24–30.11 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | ШАГ | |
| **Снежань** | 01–07.12 | | | Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Цуды на Калядах», «Ад усёй душы» (ГА «БРПА», ГА «БРСМ», снежань 2025 – студзень 2026).<br><br>Рэспубліканскі этап конкурсу «Валанцёр года – добрае сэрца» (ГА «БРСМ»).<br><br>Рэспубліканскі прававы турнір «Сіла закона» (ГА «БРСМ»).<br><br>Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Ад усёй душы» для пажылых людзей (ГА «БРСМ», снежань 2025 – студзень 2026).<br><br>Усебеларуская піянерская ёлка | | |
| | 08–14.12 | | | | Інфармацыйная гадзіна з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага | Класныя гадзіны «Мой псіхалагічны дабрабыт» |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | |
| | 15–21.12 | | | Акцыя «Нашы дзеці» (снежань – студзень) | Інфармацыйная гадзіна «Выбарчая сістэма Рэспублікі Беларусь» (IX–XI класы) | Тэматычныя занняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям'я. Мая Радзіма» |
| | 22–28.12 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | ШАГ (можа быць праведзены ў любы дзень на тыдні) | |
| **Студзень** | 29.12–04.01 | **Зімовыя канікулы 25.12.2025–07.01.2026** | | | | |
| | 05–11.01 | | | | | |
| | 12–18.01 | | | | Інфармацыйная гадзіна з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | Класныя гадзіны «Мой псіхалагічны дабрабыт» |
| | 19–25.01 | | | | | Тэматычныя занняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям'я. Мая Радзіма» |
| | 26.01–01.02 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | ШАГ | |
| **Люты** | 02–08.02 | | | Рэспубліканская інтэлектуальна-забаўляльная гульня «Вялікая акцябрацкая/піянерская/маладзёжная гульня» (ГА «БРПА»).<br><br>Конкурс макетаў аб'ектаў Вялікай Айчыннай | | |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | вайны «Аб’екты Перамогі: гісторыя ў творчасці» ва ўстановах адукацыі (ГА «БРСМ», люты – май) | | |
| | 09–15.02 | | | Рэспубліканская акцыя ГА «БРПА» і ГА «БРСМ» «Да абароны Айчыны гатовы!» | Інфармацыйная гадзіна з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | Класныя гадзіны «Мой псіхалагічны дабрабыт» |
| | 16–22.02 | | | | Інфармацыйная гадзіна «Выбарныя дзяржаўныя органы ўлады» (IX–XI класы) | Тэматычныя заняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям’я. Мая Радзіма» |
| | 23.02–01.03 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | ШАГ | |
| **Сакавік** | 02–08.03 | | | Усебеларуская акцыя «Мы – грамадзяне Беларусі»<br><br>Творчы конкурс «Наша песня» (ГА «БРСМ») (сакавік – чэрвень)<br><br>Конкурс відэаролікаў «Молодежь за безопасность» (ГА «БРСМ») (сакавік – чэрвень) | Інфармацыйная гадзіна, прысвечаная Міжнароднаму дню барацьбы з наркаманіяй (1 сакавіка) | |
| | 09–15.03 | Адзіны ўрок, прысвечаны Дню Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь (15 сакавіка) | | | Інфармацыйная гадзіна з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | Тэматычныя заняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям’я. Мая Радзіма» |
| | 16–22.03 | Адзіны ўрок, прысвечаны трагедыі ў Хатыні | | | ШАГ | Класныя гадзіны «Мой псіхалагічны |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | (22 сакавіка) | | | | дабрабыт» |
| | 23–29.03 | **Вясновыя канікулы 22.03–29.03.2026** | | | | |
| **Красавік** | 30.03–05.04 | Адзіны ўрок, прысвечаны Дню яднання народаў Расіі і Беларусі (2 красавіка) | | | | |
| | 06–12.04 | | | | Інфармацыйная гадзіна «Выбары Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь» (IX–XI класы) | Класныя гадзіны «Мой псіхалагічны дабрабыт» |
| | 13–19.04 | | | | Інфармацыйная гадзіна з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | Тэматычныя заняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям'я. Мая Радзіма» |
| | 20–26.04 | | | | ШАГ | |
| | 27.04–03.05 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | | |
| **Май** | 04–10.05 | Адзіны ўрок, прысвечаны Дню Перамогі савецкага народа ў Вялікай Айчыннай вайне (9 мая) | | Нацыянальны пошукавы праект «Беларусь памятае. Памятае кожнага» (ГА «БРПА»).<br><br>Рэспубліканскі піянерскі медыяфорум «Альфа-Спектр» (ГА «БРПА») | | |
| | 11–17.05 | Адзіны ўрок, прысвечаны Дню сям'і (15 мая) | | Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Дзень абароны дзяцей з БРСМ» (май – чэрвень) | | Класныя гадзіны «Мой псіхалагічны дабрабыт» |
| | 18–24.05 | | | | Інфармацыйная | Тэматычныя |

| | | | | | | |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | | | | гадзіна з выкарыстаннем вучэбных дапаможнікаў «Генацыд беларускага народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны» | заняткі для вучняў II–XI класаў «Я. Мая сям'я. Мая Радзіма» |
| | 25–31.05 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | ШАГ | |
| **Чэрвень** | 01–21.06 | | | Рэспубліканская дабрачынная акцыя «Дзень абароны дзяцей з БРСМ» (май – чэрвень).<br><br>Дабрачынная акцыя «Аднаўленне святынь Беларусі. Сіла адзінства»<br>(ГА «БРСМ», чэрвень – кастрычнік) | | |
| | 22–28.06 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | | |
| **Ліпень** | 29.06–05.07 | | Дэкада грамадска значных спраў да Дня Незалежнасці Рэспублікі Беларусь | | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | 27.07–02.08 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | | |
| **Жнівень** | 03–09.08 | | | Рэспубліканская дабрачынная акцыя «У школу з добрым сэрцам» (ГА «БРСМ», жнівень – верасень) | | |
| | | | | | | |
| | | | | | | |
| | 24–30.08 | | | Адзіны дзень наведвання музеяў (апошняя серада кожнага месяца) | | |

| | |
|---|---|
| Тэматычныя суботы | 1-я субота – Дзень грамадзянскага і патрыятычнага, духоўна-маральнага выхавання |
| | 2-я субота – Дзень прапаганды здаровага ладу жыцця |
| | 3-я субота – Дзень працоўнага выхавання і прафесійнай арыентацыі |
| | 4-я субота – Дзень узаемадзеяння з сям’ёй |

**Дадатак 4**

**Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі экскурсій для вучняў I–XI класаў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, у рамках арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку ў шосты школьны дзень (далей – метадычныя рэкамендацыі)**

Пры арганізацыі экскурсій для вучняў устаноў адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйныя праграмы агульнай сярэдняй адукацыі, адукацыйныя праграмы спецыяльнай адукацыі на ўзроўні агульнай сярэдняй адукацыі *(далей – УАСА),* у рамках арганізацыі адукацыйнага працэсу, у тым ліку ў канікулярны перыяд і шосты школьны дзень, неабходна кіравацца нарматыўнымі прававымі актамі:

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб адукацыі;

Закон Рэспублікі Беларусь ад 11 лістапада 2021 г. № 129-З «Аб турызме»;

Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры;

пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 11 жніўня 2022 г. № 523 «Аб аказанні турыстычных паслуг»;

пастанова Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь ад 30 чэрвеня 2008 г. № 972 «Аб некаторых пытаннях аўтамабільных перавозак пасажыраў».

У дадзеных метадычных рэкамендацыях выкарыстоўваюцца наступныя тэрміны і іх азначэнні:

*адукацыйны турызм* – від турызму, адной з мэт якога з’яўляецца задавальненне пазнавальных патрэб у пэўнай сферы дзейнасці або галіне ведаў;

*кіраўнік (намеснік кіраўніка) экскурсіі* – канкрэтная службовая асоба (настаўнік, які выкладае вучэбныя прадметы, настаўнік, які выконвае функцыі класнага кіраўніка, кіраўнік па ваенна-патрыятычным выхаванні, педагог-арганізатар), якая арганізуе экскурсію, на якую ўскладзена адказнасць і кантроль за забеспячэннем бяспекі вучняў падчас яе правядзення;

*экскурсія* – турыстычнае падарожжа на перыяд не больш за 24 гадзіны, а таксама наведванне вучнямі (экскурсантамі) турыстычных аб’ектаў пад кіраўніцтвам экскурсаводаў, гідаў-перакладчыкаў, асоб, якія працуюць у арганізацыях, пры правядзенні экскурсій у гэтых арганізацыях, суб’ектаў турыстычнай дзейнасці, іншых асоб, надзеленых правам правядзення экскурсій;

*экскурсант* – фізічная асоба (вучань), якая ажыццяўляе экскурсію без начоўкі;

*экскурсавод* – фізічная асоба, якая валодае ведамі і прафесійнымі навыкамі, неабходнымі для правядзення экскурсій на беларускай або рускай мове;

*экскурсійнае абслугоўванне* – дзейнасць суб'ектаў турыстычнай дзейнасці, а таксама іншых юрыдычных асоб, фізічных асоб, у тым ліку індывідуальных прадпрымальнікаў, па падрыхтоўцы, арганізацыі і правядзенні экскурсій, у тым ліку з выкарыстаннем аўдыягідаў (мабільных суправаджэнняў экскурсій).

Асноўнымі задачамі экскурсійнай дзейнасці з'яўляюцца:

фарміраванне грамадзянскасці, патрыятызму, нацыянальнай самасвядомасці, актыўнай грамадзянскай пазіцыі вучняў;

фарміраванне ў вучняў павагі да культурна-гістарычнай спадчыны беларускага народа, падзей Вялікай Айчыннай вайны, у тым ліку звязаных з генацыдам беларускага народа;

вывучэнне прыродных, сацыяльна-культурных аб'ектаў, гісторыка-культурных каштоўнасцей;

фарміраванне маральнай, эстэтычнай і экалагічнай культуры вучняў;

умацаванне здароўя, фізічнае ўдасканаленне, фарміраванне вопыту бяспечнай жыццядзейнасці вучняў.

Пры планаванні экскурсій неабходна ўлічваць юбілейныя і святочныя даты, узроставыя асаблівасці вучняў, адукацыйныя запыты і інтарэсы, індывідуальныя магчымасці вучняў і іх законных прадстаўнікоў. Пры планаванні экскурсій, тэматыка якіх звязана з вывучэннем вучэбных прадметаў, таксама неабходна ўлічваць тэрміны вывучэння раздзелаў вучэбных праграм.

Экскурсіі павінны быць уключаны ў гадавы план выхаваўчай работы УАСА (у раздзел, які адпавядае тэме і мэце экскурсіі).

Абавязковым для наведвання з'яўляецца **ВЯЛІКІ** АДУКАЦЫЙНЫ ШКОЛЬНЫ МАРШРУТ ПА БЕЛАРУСІ **«ПАЗНАЁМ. ГАНАРЫМСЯ. ЗАХОЎВАЕМ»**, у які ўваходзяць найбольш значныя аб'екты абласных цэнтраў і г. Мінска.

Таксама рэкамендуем на працягу навучальнага года арганізаваць экскурсіі для вучняў па **МАЛЫМ** АДУКАЦЫЙНЫМ ШКОЛЬНЫМ МАРШРУЦЕ «**ПАЗНАЁМ. ГАНАРЫМСЯ. ЗАХОЎВАЕМ**», у які ўваходзяць аб'екты малой радзімы (аб'екты свайго рэгіёна і г. Мінска).

Экскурсійныя аб'екты вызначаюцца педагагічным работнікам. Пры планаванні турыстычных маршрутаў рэкамендуем выкарыстоўваць:

*пералік экскурсійных аб'ектаў і турыстычных маршрутаў, якія рэкамендуюцца для наведвання вучнямі ў ходзе правядзення вучэбных і*

*факультатыўных заняткаў, выхаваўчых мерапрыемстваў з улікам зместу вучэбных праграм па вучэбных прадметах;*

*пералік турыстычна-экскурсійных маршрутаў «Праваслаўныя святыні Беларусі».*

**Названыя пералікі размешчаны на сайце Рэспубліканскага цэнтра экалогіі і краязнаўства** (https://rcek.by).

Акрамя таго, на сайце Рэспубліканскага цэнтра экалогіі краязнаўства прадстаўлены:

«Адукацыйныя маршруты па абласцях» (https://rcek.by/obrazovatelnye-marshruty-po-oblastyam);

«Адукацыйныя маршруты па раёнах» (https://rcek.by/obrazovatelnye-marshruty-po-rajonu);

«Адукацыйныя маршруты па малой радзіме» (https://rcek.by/obrazovatelnye-marshruty-po-maloj-rodine);

каталог маршрутаў экскурсій і турыстычных паходаў «Дарогамі воінскай славы», які ўключае кароткае апісанне маршрутаў і кюар-коды з інфармацыяй аб аб’ектах (https://rcek.by/katalog-dorogami-voinskoj-slavy).

Рэкамендуем таксама выкарыстоўваць інфармацыю аб адукацыйных маршрутах, размешчаную на сайтах абласных устаноў дадатковай адукацыі:

ДУА «Брэсцкі абласны цэнтр турызму і краязнаўства дзяцей і моладзі» (http://bresttur.by/экскурсii);

ДУДА «Віцебскі абласны палац дзяцей і моладзі» (https://centers.by/sprobrmarsch21);

ДУА «Гомельскі абласны цэнтр турызму і экалогіі дзяцей і моладзі» (https://gomelcte.by/jekskursii/#1676131507770-cb3691ae-3b23);

ДУА «Гродзенскі абласны цэнтр турызму і краязнаўства» (https://centrture.edu-grodno.gov.by/тырызм-і-экскурсійная-дзейнасць/адукацыйны-турызм/зборнік-экскурсійных-маршрутаў);

ДУА «Мінскі абласны інстытут развіцця адукацыі» (https://moiro.by/накірункі/выхаваўчая-работа/накірункі-выхаваўчай-дзейнасці/адукацыйны-турызм);

ДУДА «Магілёўскі абласны цэнтр творчасці» (https://moct.by/meropriyatiya/obrazovatelnyj-turizm);

УА «Мінскі дзяржаўны турысцка-экалагічны цэнтр дзяцей і моладзі» (https://mgtec.minskedu.gov.by/дзейнасць/адукацыйны-турызм).

Пры выбары экскурсійнага маршруту асаблівае значэнне неабходна надаць наведванню ваенна-гістарычных экскурсійных аб’ектаў: музееў, мемарыяльных комплексаў, прысвечаных падзеям Вялікай Айчыннай вайны («Брэсцкая крэпасць-герой», «Хатынь», «Буйніцкае поле»,

«Трасцянец», гісторыка-культурны комплекс «Лінія Сталіна», Курган Славы, Беларускі дзяржаўны музей гісторыі Вялікай Айчыннай вайны і інш.).

Прымаючы пад увагу, што ў Рэспубліцы Беларусь функцыянуе значная колькасць дзяржаўных, ведамасных, а таксама школьных музеяў рознага профілю, рэкамендуецца іх наведванне ў адпаведнасці са спецыялізацыяй музейных устаноў.

УАСА могуць ажыццяўляць набыццё **уваходных білетаў** (для вучняў I–XI класаў, кіраўніка экскурсіі, намесніка кіраўніка экскурсіі) на турыстычныя аб’екты ў рамках экскурсіі па **ВЯЛІКІМ** АДУКАЦЫЙНЫМ ШКОЛЬНЫМ МАРШРУЦЕ «**ПАЗНАЁМ. ГАНАРЫМСЯ. ЗАХОЎВАЕМ**» **(з перыядычнасцю 2 разы на год на кожнага вучня)** за кошт сродкаў рэспубліканскага або мясцовых бюджэтаў, якія прадугледжваюцца для ўстаноў адукацыі на іх функцыянаванне заснавальнікамі. Названыя выдаткі могуць прадугледжвацца за кошт іншых крыніц, не забароненых заканадаўствам.

Класныя кіраўнікі павінны даводзіць да ведама вучняў і іх законных прадстаўнікоў інфармацыю аб запланаваных на працягу года экскурсіях, у тым ліку абавязковых для наведвання кожным вучнем па ВЯЛІКІМ і МАЛЫМ АДУКАЦЫЙНЫХ ШКОЛЬНЫХ МАРШРУТАХ.

Рашэнне аб арганізацыі экскурсіі афармляецца загадам кіраўніка УАСА, у якім павінны быць адлюстраваны:

тэрміны правядзення экскурсіі, маршрут і спіс удзельнікаў; прызначэнне службовых асоб (кіраўніка экскурсіі і яго намесніка) з ускладаннем на іх адказнасці і кантролю за забеспячэннем бяспекі вучняў падчас экскурсіі;

адпаведныя змены ў раскладзе вучэбных заняткаў.

Правядзенне экскурсіі можа ажыццяўляцца на працягу любога вучэбнага дня тыдня (з панядзелка па пятніцу), а таксама ў пазавучэбны час, у тым ліку ў канікулярны перыяд і шосты школьны дзень.

***Пры правядзенні экскурсіі, тэматыка якой адносіцца да вывучэння канкрэтнага вучэбнага прадмета,*** запіс у класным журнале аб правядзенні вучэбных заняткаў (па гэтым вучэбным прадмеце) у форме экскурсіі афармляецца ў адпаведнасці з унесенымі ў расклад зменамі.

Падчас правядзення вучэбных заняткаў па вучэбным прадмеце ў форме экскурсіі неабходна прапаноўваць вучням заданні з апорай на веды, набытыя падчас наведвання экскурсійных аб’ектаў. Варта прадугледзець абагульненне і замацаванне вучэбнага матэрыялу ў розных формах. Па рашэнні настаўніка за выкананне заданняў вучням

могуць выстаўляцца адзнакі ў класны журнал па дадзеным вучэбным прадмеце.

***Пры правядзенні экскурсіі, тэматыка якой не адносіцца да вывучэння канкрэтнага вучэбнага прадмета,*** запіс гадзін ажыццяўляецца ў класным журнале адпаведнага класа, для якога арганізавана экскурсія, у раздзеле «Арганізацыйна-выхаваўчая работа».

Кіраўнік УАСА (яго намеснік) абавязаны правесці з кіраўніком і намеснікам кіраўніка экскурсіі мэтавы інструктаж аб захаванні мер бяспекі вучнямі УАСА з наступным афармленнем у журнале рэгістрацыі інструктажу.

Кіраўнік экскурсіі абавязаны дапускаць да ўдзелу ў экскурсіі вучняў з пісьмовага дазволу аднаго з законных прадстаўнікоў непаўналетняга (з указаннем асаблівасцей здароўя пры іх наяўнасці).

Пры перавозцы аўтобусамі арганізаваных груп вучняў у нерэгулярных зносінах забеспячэнне бяспечных паводзін вучняў ускладаецца на кіраўніка экскурсіі і яго намесніка.

Пры аўтамабільнай перавозцы групы вучняў кіраўнік УАСА абавязаны загадзя, не пазней за пяць сутак да пачатку перавозкі, прадставіць аўтамабільнаму перавозчыку зацверджаныя спісы вучняў і асоб, якія іх суправаджаюць. У спісе вучняў павінны пазначацца іх прозвішчы, ініцыялы і даты нараджэння.

Экскурсійнае абслугоўванне на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь праводзяць экскурсаводы і педагагічныя работнікі, якія прайшлі прафесійную атэстацыю, якая пацвярджае кваліфікацыю экскурсавода.

Настаўнік таксама мае магчымасць правесці вучэбныя заняткі; настаўнік, які выконвае функцыі класнага кіраўніка, мае магчымасць правесці пазавучэбнае мерапрыемства ў форме экскурсіі без прыцягнення экскурсавода ў адпаведнасці з патрабаваннямі Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб культуры.

У выпадку заказу экскурсіі праз турыстычную арганізацыю экскурсійнае абслугоўванне ажыццяўляецца на падставе дагавора аказання турыстычных паслуг.

Пры фарміраванні групы, якая складаецца з непаўналетніх асоб, дагавор аказання турыстычных паслуг у дачыненні да іх могуць заключаць законныя прадстаўнікі непаўналетніх або кіраўнік экскурсіі на падставе даверанасці. Даверанасць, складзеная ва ўстаноўленым заканадаўствам парадку, выдаецца законнымі прадстаўнікамі непаўналетніх кіраўніку экскурсіі.

**Дадатак 5**

## Вядзенне праграмна-плануючай дакументацыі выхавання

Планаванне, арганізацыю і кантроль сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы згодна з 28 Адзіным кваліфікацыйным даведнікам пасад служачых «Пасады служачых, занятых у адукацыі» (пастанова Міністэрства працы і сацыяльнай абароны Рэспублікі Беларусь ад 29.07.2020 № 69) ажыццяўляе намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце.

Пералік дакументаў, абавязковых для вядзення асобнымі педагагічнымі УАСА, вызначаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 05.11.2024 № 143 «Аб змяненні пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 27.12.2017 № 164».

Кіраўніком УАСА ўдакладняецца пералік дакументаў у дзейнасці **канкрэтнага** УАСА: наменклатура спраў УАСА складаецца з улікам пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 28.11.2022 № 450 «Аб пераліку дакументаў, якія ўтвараюцца ў працэсе дзейнасці Міністэрства адукацыі».

Пры планаванні сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы неабходна забяспечыць распрацоўку праграмна-плануючай дакументацыі выхавання, прадугледжанай артыкулам 87 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, у тым ліку плана выхаваўчай работы ўстановы адукацыі на навучальны год, які можа быць раздзелам («План выхаваўчай работы») плана работы УАСА на навучальны год.

Рэкамендуемая форма планавання выхаваўчай работы на навучальны год:

ПЛАН ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ
ДУА «_______________________________»
(поўная назва ўстановы адукацыі)
на 20__/20__ навучальны год

| № п/п | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання | Месца правядзення | Удзельнікі | Адказныя за правядзенне |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Мерапрыемствы па рэалізацыі складальнікаў выхавання | | | | |
| 1.1. | Ідэалагічнае выхаванне | | | | |
| | | | | | |
| 1.2. | Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне ** | | | | |
| | | | | | |

** ***Заўвага:*** *і г. д. па напрамках выхаваўчай работы*

Асноўныя напрамкі сацыяльнай, выхаваўчай і ідэалагічнай работы прадугледжаны Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб адукацыі, Канцэпцыяй і Праграмай бесперапыннага

выхавання дзяцей і вучнёўскай моладзі і абавязковыя для рэалізацыі ва ўсіх установах агульнай сярэдняй адукацыі.

План выхаваўчай работы УАСА на новы навучальны год распрацоўваецца на аснове **аналізу выхаваўчай работы**, у якім паказваюцца як станоўчыя вынікі выхаваўчай работы, так і недахопы (праблемы), выяўленыя ў ходзе правядзення самакантролю ва УАСА, а таксама аналізу вынікаў маніторынгу выхаванасці вучняў. Ацэнка выніковасці працэсу выхавання павінна паказваць, наколькі адпавядаюць пастаўленым мэтам змест работы, выбраныя метады, сродкі і формы, наколькі ўлічаны псіхолага-педагагічныя ўмовы і інш. Аналіз выхаваўчай работы павінен быць кароткім, да 20 старонак.

**План выхаваўчай работы** з’яўляецца лакальным арганізацыйна-кіраўніцкім дакументам, што ўяўляе сабой дзейнасць педагагічнага калектыву на працягу навучальнага года. Планы выхаваўчай работы настаўнікаў, якія выконваюць функцыі класных кіраўнікоў, кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні, педагога-псіхолага, педагога сацыяльнага, педагога-арганізатара, бібліятэкара, павінны карэлявацца з гадавым планам работы УАСА.

Кіраўнікі па ВПВ, педагогі-арганізатары, педагогі сацыяльныя, педагогі-псіхолагі ажыццяўляюць сваю дзейнасць на падставе ўласных планаў, ключавыя мерапрыемствы якіх уваходзяць у план па рэалізацыі адпаведных напрамкаў выхаваўчай работы УАСА.

Работа кіраўніка па ваенна-патрыятычным выхаванні ва УАСА ажыццяўляецца на аснове плана работы, які з’яўляецца раздзелам плана выхаваўчай работы УАСА. Намесніку дырэктара па выхаваўчай рабоце неабходна ўключаць пытанні стану ваенна-патрыятычнага выхавання, у тым ліку дзейнасці кіраўніка ВПВ, у план самакантролю УАСА.

Дзейнасць па сацыяльна-педагагічнай падтрымцы вучняў і аказанні ім псіхалагічнай дапамогі адлюстроўваецца ў раздзеле плана работы УАСА на навучальны год «Забеспячэнне сацыяльна-педагагічнай падтрымкі вучняў і аказанне ім псіхалагічнай дапамогі». Пытанні эфектыўнасці яе ажыццяўлення знаходзяцца на кантролі намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце і павінны ўключацца ў план самакантролю УАСА, які таксама з’яўляецца часткай плана работы ўстановы адукацыі на навучальны год.

У кампетэнцыю намесніка дырэктара па выхаваўчай рабоце ўваходзіць падрыхтоўка планаў:

выхаваўчай работы УАСА;

ідэалагічнай работы з працоўным калектывам на навучальны год (у адпаведнасці з Дырэктывай Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь ад 09.04.2025 № 12 «Аб рэалізацыі асноў ідэалогіі беларускай дзяржавы»;

выхаваўчай работы УАСА на канікулах;

выхаваўчай работы УАСА ў шосты школьны дзень;

выхаваўчай работы з дзецьмі, якія маюць патрэбу ў аздараўленні (складаецца на перыяд рэалізацыі праграмы выхавання дзяцей, якія маюць патрэбу ў аздараўленні);

рэалізацыі праграмы рэспубліканскага праекта «Бацькоўскі ўніверсітэт»;

вучэбна-метадычнага аб’яднання (фарміравання) класных кіраўнікоў на навучальны год;

рэгламенту работы вучнёўскага савета УАСА (пункт 16 Палажэння аб студэнцкім (вучнёўскім) савеце ўстановы адукацыі).

У адпаведнасці з Метадычнымі рэкамендацыямі па парадку і перыядычнасці правядзення самакантролю за забеспячэннем якасці адукацыі ад 23.01.2025 (пункт 25) намеснік дырэктара па выхаваўчай рабоце ў рамках самакантролю аналізуе:

*штогод* паўнату і актуальнасць праграмна-плануючай дакументацыі выхавання; арганізацыйнае, інфармацыйна-аналітычнае і метадычнае забеспячэнне ідэалагічнай і выхаваўчай работы ва ўстанове адукацыі; умовы, створаныя ва ўстанове адукацыі для сацыялізацыі і самаразвіцця асобы вучня, стымулявання сацыяльнай актыўнасці вучняў і падтрымкі іх грамадска значных ініцыятыў; эфектыўнасць арганізацыі ідэалагічнай і выхаваўчай работы з вучнямі;

*штоквартальна* – выкананне праграмна-плануючай дакументацыі выхавання.

Аб’екты самакантролю, від і мэты, тэрміны, адказныя за правядзенне, а таксама парадак падвядзення вынікаў паказваюцца ў плане работы УАСА на навучальны год. Пры прыцягненні да арганізацыі самакантролю іншых педагагічных работнікаў у адпаведнасці з пунктамі 12, 13 Метадычных рэкамендацый фарміруецца камісія па правядзенні самакантролю, Праграма правядзення самакантролю.

У адпаведнасці з пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 22.09.2022 № 332 «Аб правядзенні выхаваўчай работы педагагічнымі работнікамі ў пазавучэбны час з вучнямі», выхаваўчая работа ў пазавучэбны час – мэтанакіраваная, сістэматычная і планавана дзейнасць педагагічных работнікаў.

Планаванне класнага кіраўніка ўключае распрацоўку плана выхаваўчай работы ў класе на паўгоддзе (верасень – снежань, студзень – жнівень).

Працэс дакументавання арганізацыйна-выхаваўчай работы класнага кіраўніка рэгламентаваны Інструкцыяй аб парадку вызначэння аплатных гадзін арганізацыйна-выхаваўчай работы і дадатковага кантролю вучэбнай дзейнасці вучняў ва ўстановах адукацыі, зацверджанай пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 13.05.2023 № 156 «Аб змяненні пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.11.2004 № 70». Для выканання арганізацыйна-выхаваўчай работы ў навучальным годзе усталёўваецца ў сярэднім 5 гадзін на тыдзень на адзін клас. Колькасць тарыфікуючых гадзін на аднаго класнага кіраўніка вызначаецца рашэннем кіраўніка УАСА ў залежнасці ад віду арганізацыйна-выхаваўчай работы, узроўню складанасці, навізны прымяняемых формаў кантролю вучэбнай дзейнасці вучняў. Фактычнае выкананне арганізацыйна-выхаваўчай работы **адлюстроўваецца настаўнікам у журнале** аналагічна запісам аб праведзеных навучальных занятках.

Варта адзначыць, што пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 06.12.2021 № 253 унесены змяненні ў пастанову Міністэрства адукацыі ад 03.06.2019 № 71 «Аб аплаце працы работнікаў у сферы адукацыі», згодна з якімі загадам кіраўніка УАСА на навучальны год (з 1 верасня па 31 жніўня) у памеры 100 % базавай стаўкі на месяц класным кіраўнікам устанаўліваецца надбаўка пры выкананні функцый класнага кіраўніка, уключаючы перыяды **знаходжання вучняў на канікулах**.

У адпаведнасці з метадычнымі рэкамендацыямі Міністэрства адукацыі па арганізацыі выхаваўчай работы ў канікулярны перыяд, шосты школьны дзень у план выхаваўчай работы класнага кіраўніка на паўгоддзе могуць уносіцца змяненні і дапаўненні з мэтай удакладнення і карэкціроўкі (у канцы плана рэкамендуецца ажыццяўляць запіс *«У плане работы магчымы змены і дапаўненні»*).

Вядзенне класнымі кіраўнікамі тэм па самаадукацыі, справаздач аб рэалізацыі праекта «Бацькоўскі ўніверсітэт», фарміраванню фінансавай адукаванасці і інш. з’яўляецца залішняй (недапушчальнай).

План выхаваўчай работы з вучнямі канкрэтнага класа змяшчае:

аналіз выхаваўчай работы за папярэдні навучальны год;

мэта і задачы выхаваўчай работы на навучальны год;

мерапрыемствы па рэалізацыі асноўных напрамкаў выхавання на паўгоддзе, у тым ліку ў шосты школьны дзень і канікулярны перыяд;

тэрміны, месца іх правядзення, указанне ўдзельнікаў мерапрыемстваў і асоб, адказных за правядзенне (артыкул 87 Кодэкса Рэспублікі Беларусь аб адукацыі);

узаемадзеянне з сям’ёй;

ажыццяўленне індывідуальнай работы з вучнямі.

Рэкамендуемая форма планавання выхаваўчай работы з вучнямі канкрэтнага класа на паўгоддзе:

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дырэктар __________________
(поўная назва ўстановы адукацыі)
___________________________
«___» _______________ 20___ г.

ПЛАН ВЫХАВАЎЧАЙ РАБОТЫ
З ВУЧНЯМІ ____ «____» класа
ДУА «________________________________»
(поўная назва ўстановы адукацыі)
на I (II) паўгоддзе 20__/20__ навучальнага года

1. Аналіз выхаваўчай работы за папярэдні навучальны год.
2. Мэта і задачы выхаваўчай работы на навучальны год.
3. Змест дзейнасці ў адпаведнасці з табліцай:

| № п/п | Назва мерапрыемства | Тэрмін выканання | Месца правядзення | Удзельнікі | Адказныя за правядзенне |
|---|---|---|---|---|---|
| 1. | Мерапрыемствы па рэалізацыі асноўных складальнікаў выхавання | | | | |
| 1.1. | Ідэалагічнае выхаванне | | | | |
| | | | | | |
| 1.2. | Грамадзянскае і патрыятычнае выхаванне* | | | | |
| | | | | | |
| 2. | Узаемадзеянне з сям'ёй | | | | |
| | | | | | |
| 3. | Індывідуальная работа з вучнямі | | | | |
| | | | | | |

**Заўвага*: *і г. д. па раздзелах (напрамках)*

Прыкладная структура аналізу выхаваўчай работы за мінулы навучальны год:

аналіз дасягнення мэт і задач выхаваўчай работы ў папярэднім навучальным годзе;

аналіз выніковасці праведзеных выхаваўчых мерапрыемстваў;

аналіз вынікаў маніторынгу ўзроўню выхаванасці вучняў;

праблемы выхаваўчай работы ў папярэднім навучальным годзе, шляхі іх вырашэння.

План выхаваўчай работы класнага кіраўніка павінен адлюстроўваць узаемадзеянне з педагогам-арганізатарам, педагогам-псіхолагам, педагогам сацыяльным, кіраўніком па ваенна-патрыятычным выхаванні, работнікамі бібліятэкі, органамі вучнёўскага самакіравання ўстановы адукацыі і інш.

**Дадатак 6**

## Пералік нарматыўных дакументаў для арганізацыі дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі

Установам адукацыі, якія рэалізуюць адукацыйную праграму дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі, у межах кампетэнцыі ў сваёй рабоце варта кіравацца наступнымі дакументамі:

Метадычныя ўказанні аб вызначэнні парадку распрацоўкі і зацвярджэння праграм аб’яднанняў па інтарэсах з павышаным узроўнем вывучэння адукацыйнай вобласці, тэмы, вучэбнага прадмета або вучэбнай дысцыпліны (дадатак да пісьма Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 05.02.2025 № 06-01-14/1507/дс/);

Метадычныя ўказанні па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і арганізацыі адукацыйнага працэсу (дадатак да пісьма Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 11.06.2024 № 06-01-14/6880/дс/);

Рэкамендацыі па распрацоўцы індывідуальных праграм дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі для адораных вучняў (дадатак да Метадычных указанняў па распрацоўцы вучэбна-праграмнай дакументацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі і арганізацыі адукацыйнага працэсу);

Палажэнне аб установе дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (зацверджана пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.07.2011 № 149 (у рэдакцыі пастановы ад 19.09.2022 № 318, у рэдакцыі пастановы ад 12.12.2024 № 189 «Аб змяненні пастановы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 25.07.2011 № 149»));

Правілы правядзення атэстацыі вучняў пры засваенні зместу адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 11.12.2020 № 301 (у рэдакцыі пастановы ад 19.09.2022 № 319));

Правілы бяспекі арганізацыі адукацыйнага працэсу, арганізацыі выхаваўчага працэсу пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі (зацверджаны пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 03.08.2022 № 227);

загад Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 07.10.2022 № 603 «Аб парадку функцыянавання аб’яднанняў па інтарэсах»;

загад Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 18.06.2024 № 282 «Аб змяненні загаду Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь № 603 ад 07.10.2022»;

«Аб тыпавых праграмах дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі» (пастанова Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.10.2023 № 235);

«Аб накіраванні растлумачэнняў па ўстанаўленні кантрольных лічбаў прыёму для атрымання дадатковай адукацыі дзяцей і моладзі за кошт сродкаў рэспубліканскага і (або) мясцовых бюджэтаў» (пісьмо Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 20.03.2025 № 06-01-14/3447/дс).